

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ПЕДАГОГАЎ 6

НАВОШТА БЕЛАРУСЫ МЯНЯЮЦЬ ІМЯ 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 САКАВІКА 2021 г. СЕРАДА № 44 (29413)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віталь ДРОЖЖА, міністр лясной гаспадаркі:**

*«З сыравіннай краіны мы ператварыліся ў перапрацоўчую. Гэта вынік велізарнай работы, якая праводзілася ў нас на працягу апошніх гадоў. Адна з ключавых задач сёння — перафарматаванне цэхаў лясгасаў. Мы дакладна звужаемся ў частцы сыравіны. І ўжо сёння павінны разумець, якія рэсурсы зможам перапрацоўваць заўтра. Наша задача — забяспечыць занятасць людзей у невялікіх гарадах і сельскай мясцовасці, даць ім добрую заработную плату. Пры гэтым зароблены сродкі павінны дазваляць і ў далейшым інвеставаць у вытворчасць».*

# Бабулін клопат



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ірына ШАБАЛІНА ў мінулым прафесійна займалася спортам: яна майстар спорту па мастацкай гімнастыцы. Цяпер жанчына клапоціцца аб тым, каб і ўнукі вялі здаровы спосаб жыцця. Кожны дзень пяцігадовы Іван і трохгадовы Андрэй адпраўляюцца з бабуляй на актыўную прагулку ў сталічны парк Чалюскінцаў.

## КОРАТКА

- У Брэсце 10 сакавіка пачнуць вакцынаваць ад каранавіруса работнікаў адукацыі і сацыяльнай абароны.
- **«Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Тэль-Авіў да 20 сакавіка.**
- Беларускія дэсантнікі прымуць удзел у батальённым вучэнні ў Расіі.
- **Больш за 20 нелегалаў затрыманыя на беларуска-літоўскай мяжы.**
- Міжнародная бізнес-прэмія «Лідар года 2021» абвясціла прыём заявак на ўдзел.
- **Пагадненне аб дзецях з 1 ліпеня 2020 года заключылі 76 бацькоўскіх пар.**
- Фінал «Залатой шайбы» ў малодшай узроставай групе дывізіёна А пройдзе ў Бабруйску.

Сітуацыя

## НАПЯРЭДАДНІ «ВЯЛІКАЙ ВАДЫ»

### Моцнай паводкі на Гомельшчыне не прагназуецца



Фота з архіва «Звязды».

СТАР. 5

Жыллё

## Галоўнае, каб кошт «квадрата» быў не большы за памер сярэдняй зарплаты

**Такую думку выказаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі — начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр АЎРАМЕНКА, падводзячы вынікі мінулага года і гаворачы пра планы на 2021 год.**

### І сёлета план будзе перавыкананы

Аляксандр Аўраменка адзначыў, што летась быў запланаваны ўвод чатырох мільёнаў квадратных метраў жылля, але было рэалізавана 4,156 мільёна «квадратаў». Акрамя таго, планавалася ўвесці 984 тысячы квадратных метраў з дзяржпадтрымкай, пабудавана ж 1,306 мільёна «квадратаў». Спікер падкрэсліў, што кожны «лішні» квадратны метр — дадатковы дабрабыт для грамадзян. Ён распавёў, што на 2021 год запланаваны ўвод чатырох мільёнаў «квадратаў» жылля, з якіх 1 мільён — з дзяржаўнай падтрымкай.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на ІІ квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# РОСТ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

**Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу па развіцці новых кірункаў работы ў структуры Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта.**

Кіраўнік спраў Прэзідэнта Віктар Шэйман далажыў беларускаму лідару аб выніках работы Кіраўніцтва справамі, падпарадкаваных арганізацый і прадпрыемстваў за 2020 год. Спрацавалі добра, тэмп росту — 150,4 %, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ і паслуг склала Br2,7 млрд. Забяспечаны рост дабаўленай вартасці ў 2,5 раза. Прадукцыйнасць работы па дабаўленай вартасці павялічылася амаль у 2,6 раза.

Эфектыўна спрацаваў сельскагаспадарчы сектар — тэмп росту аб'ёмаў валавой прадукцыі да 2019 года склаў 115,6 %. Рост адзначаецца па ўсіх кірунках, уключаючы ўраджай збожжавых, вытворчасць малака, жывёлы і птушкі. Тэмп росту аб'ёмаў прамысловай прадукцыі склаў 104,6 %.

Віктар Шэйман праінфармаваў, што добра спрацавала і будаўнічая галіна. Павялічаны аб'ёмы вытворчасці з чыстым прыбыткам. Сярод канкрэтных праектаў — завершана будаўніцтва музея пад адкрытым небам у Нацыянальным парку «Прыпяцкі».

Што датычыцца турыстычнага кірунку, то было адзначана, што эпідэмічная сітуацыя 2020 года негатыўна адбілася на рабоце — знізілася загрузка ў атэлях і санаторыях.

Абарот знешняга гандлю таварамі і паслугамі па лініі Кіраўніцтва справамі ў 2020 годзе склаўся ў памеры $240,8 млн. Экспарт тавараў і паслуг склаў амаль $197 млн.

Заслухаўшы даклад, кіраўнік дзяржавы паставіў задачу па далейшым нарошчванні вытворчасці, развіцці новых кірункаў работы. Напрыклад, асаблівую ўвагу даручана аддаць сферы дрэваапрацоўкі, а таксама нарошчванню абаротаў у турыстычнай галіне.

Традыцыйна ў час сустрэчы з кіраўніком спраў абмяркоўвалася і супрацоўніцтва з краінамі афрыканскага кантынента. Як было далажана, на сённяшні дзень ідзе працэс стварэння прадпрыемстваў сельскагаспадарчых, будаўнічых і па транспарціроўцы і перавозцы грузаў.

# «РЭПЕТЫЦЫЯ» НА ДРУГІМ РЭАКТАРЫ АЭС

**З запланаваных 394 выпрабаванняў этапу доследна-прамысловай эксплуатацыі першага энергаблока БелАЭС выканана ўжо 259. Сёння яго планава адключаць для наступных выпрабаванняў. А ў корпус рэактара другога энергаблока 7 сакавіка загрузілі першы са 163 імітатараў цеплавыдзяляльных зборак (ІЦВЗ).**




Імітатары з'яўляюцца дакладнай копіяй ЦВЗ і поўнасцю паўтараюць іх канструкцыю па вазе, памеры і матэрыялах, аднак не ўтрымліваюць ядзернага паліва. Іх выкарыстоўваюць замест штатных цеплавыдзяляльных зборак падчас пусканаладачных работ для праверкі рэактарнай установкі на адпаведнасць праектным характарыстыкам і патрабаванням бяспекі, паведамілі ў Мінэнерга.

Загрузка імітатараў — неабходная ўмова і ў пэўным сэнсе генеральная рэпетыцыя загрузкі ядзернага паліва ў рэактар, адзначылі ў інжынірынгавым дывізіёне дзяржкарпарацыі «Расатам», якая з'яўляецца галоўным праекціроўшчыкам і падрадчыкам БелАЭС. Гэты працэс уключае ў сябе адпрацоўку транспартна-тэхналагічных аперацый па перамяшчэнні ІЦВЗ са спецыяльнага сховішча свежага паліва ў будынак рэактара і пацвярджэнне гатоўнасці перагрузачнай машыны.



— *Пачатак загрузкі ІЦВЗ — пацвярджэнне гатоўнасці рэактара, транспартна-тэхналагічнага абсталявання і яго аснашчэння, сістэм і асноўнага абсталявання рэактарнай установкі да этапу халодна-гарачай абкаткі,* — падкрэсліў **Віталь ПАЛЯНІН, віцэ-прэзідэнт-дырэктар праекта па стварэнні БелАЭС інжынірынгавай кампаніі «АСЭ».** — *Пасля загрузкі ўсіх 163 ІЦВЗ спецыялісты завершаць зборку рэактара, а пасля атрымання адпаведных дазволаў пачнуць этап гідраўлічных выпрабаванняў. Тым самым распачнецца вялізны цыкл абавязковых і строга рэгламентаваных тэхналагічна складаных працэсаў, якія праводзяцца падчас падрыхтоўкі энергаблока да фізічнага пуску.*

**Ірына СІДАРОК.**

**Фота прэс-службы дзяржкарпарацыі «Расатам».**

# Стабільнасць будзе забяспечана

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнай бяспекі Івана Тэртэля. У цэнтры ўвагі — тэматыка бягучай работы КДБ, сітуацыя ў сферы нацыянальнай бяспекі, абароны канстытуцыйнага ладу.**

«Падчас даклада кіраўніку дзяржавы былі абазначаны асноўныя праблемы, звязаныя з гарантаваннем нацыянальнай бяспекі, тыя пагрозы, якія фарміруюцца ў сферы знешнепалітычнай дзейнасці, унутранай сітуацыі, — паведаміў Іван Тэртэль журналістам пра выніку размовы з Прэзідэнтам. — У цэлым мы канстатуем, што абстаноўка ў краіне стабільная. Разам з тым звяртаем увагу на некалькі момантаў. Першае, на беспрэцэдэнтны ціск на дзяржаву з боку замежных партнёраў, якія звязаны з санкцыйнай палітыкай і некаторымі іншымі рэчамі. Другое, на спробы і планы некаторых асоб па дэстабілізацыі сітуацыі ў найбліжэйшы час. Мы кажам пра перыяд 25—27 сакавіка».

Камітэт дзяржаўнай бяспекі адзначае рост тэрарыстычных пагроз, дадаў кіраўнік ведамства.

«На жаль, яны адбываюцца з тэрыторыі нашых суседзяў, як правіла, сумежных дзяржаў», — сказаў ён.

Камітэту даручана мінімізаваць названыя пагрозы, сілавыя органы маюць дастаткова сіл і сродкаў для рэагавання на іх, абстаноўка ў краіне будзе стабільная, запэўніў Іван Тэртэль.

«Востры перыяд, які быў характэрны для другой паловы 2020 года, вычарпаны, — лічыць старшыня КДБ. — Сітуацыя стабільная. Разам з тым замежныя, як мы называем іх, падрыўныя цэнтры і спецслужбы, якія стаяць за імі, зацікаўленыя палітычныя колы робяць спробы па аднаўленні пратэснай актыўнасці, па дэстабілізацыі сітуацыі ў краіне ў гэты вясновы перыяд. Пра гэта вядома было раней, на працягу некалькі месяцаў анансавалася. Мы падрыхтаваныя да гэтага і прымем усе меры, каб асобы і арганізацыі, якія зробяць такія спробы, панеслі ў адпаведнасці з заканадаўствам адказнасць».

На пытанне журналістаў пра затрыманне групы, якая падазраецца ў тэрарызме, пра што расказаў Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання мотавелазавода, Іван Тэртэль адказаў: «Так, сапраўды, мы затрымалі групу асоб, забралі ў іх вялікую колькасць зброі, боепрыпасаў, сродкаў дыстанцыйнага падрыву, выбуховых рэчываў. Гэта дастаткова высокага ўзроўню прафесіяналы».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Засумавалі па чыгуначных паездках

**За першы месяц курсіравання фірменны цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква перавёз больш за 16,5 тысячы пасажыраў.**

Пры гэтым у зносінах Мінск — Масква перавезена каля 9 тысяч пасажыраў, запаўняльнасць саставу склала амаль 100 працэнтаў. У адваротным кірунку — больш за 7,6 тысячы грамадзян, запаўняльнасць саставу — каля 90 працэнтаў, паведаміў прэс-цэнтр магістралі.

Нагадаем, што міжнародныя пасажырскія зносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй у адпаведнасці з рашэннем урада Расійскай Федэрацыі аднаўлены з 0.00 гадзін 8 лютага. Першым цягніком, які адправіўся з Беларусі ў Расію пасля 10-месячнага перапынку, стаў фірменны цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква фарміравання БЧ.

У цяперашні час ён адпраўляецца з Мінска па цотных, а з Масквы па няцотных днях і робіць падчас руху прыпынкі для пасадкі/высадкі пасажыраў на станцыях Орша-Цэнтральная, Смаленск і Вязьма.

Усяго з моманту адкрыцця продажу праязных дакументаў (4 лютага) на цягнікі ў зносінах з Расійскай Федэрацыяй рэалізавана ўжо больш за 43 тысячы квіткоў. З іх амаль 65 працэнтаў ці 28,4 тысячы праязных дакументаў — на фірменны цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква.

На магістралі ў чарговы раз звярнулі ўвагу, што ў цяперашні час праезд у зносінах Мінск — Масква — Мінск магчымы толькі для грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Акрамя таго, з улікам бягучай эпідэмічнай сітуацыі Беларуская чыгунка рэкамендуе пасажырам пры набыцці праязных дакументаў больш актыўна выкарыстоўваць электронныя каналы продажаў: афіцыйная мабільная праграма Беларускай чыгункі «БЧ. Мой цягнік» і абноўлены раздзел «Паслугі пасажырам» на афіцыйным сайце Беларускай чыгункі (pass .rw. by). Рэалізацыя праязных дакументаў на міжнародныя пасажырскія цягнікі вядзецца за 60 сутак да іх адпраўлення.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Венгрыя абвясціла самы жорсткі лакдаўн




У Венгрыі ўступілі ў сілу самыя жорсткія з пачатку пандэміі абмежавальныя меры. Да 7 красавіка ў краіне будуць закрыты дзіцячыя сады і пачатковыя школы. Да 22 сакавіка спынілі работу прадпрыемствы сферы паслуг, а таксама ўсе крамы, за выключэннем прадуктовых і аптэк. Пра новыя абмежаванні ўлады абвясцілі на фоне росту колькасці выпадкаў заражэння каранавірусам. У мінулыя выхадныя ў Будапешце і іншых буйных гарадах адбыўся ўсплёск пакупніцкай актыўнасці. Урад заклікаў кіраўнікоў прадпрыемстваў (там, дзе гэта магчыма) перавесці супрацоўнікаў на аддалены рэжым работы. У краіне ідзе актыўная кампанія па вакцынацыі насельніцтва. Даступныя пяць прэпаратаў: амерыкана-германскага кансорцыўма Pfizer — BioNTech, амерыканскай кампаніі Moderna, брытанска-шведскай AstraZeneca, расійская вакцына «Спадарожнік V» і кітайская прышчэпка.

## У Швейцарыі забаранілі насіць паранджу і нікаб

У краіне адбыўся рэферэндум, на якім перамаглі прыхільнікі закона аб забароне закрываць твар у грамадскіх месцах. Пасля таго як адпаведнае заканадаўства прымуць, у краіне больш нельга будзе насіць жаночую мусульманскую вопратку, якая хавае твар, у тым ліку паранджу і нікаб. Прынясце закона падтрымалі 51,2 працэнта ўдзельнікаў рэферэндуму, супраць выказаліся 48,8 працэнта. Галасаванне было праведзена па ініцыятыве правай Швейцарскай народнай партыі, якая вяла агітацыю пад лозунгам «Не экстрэмізму». У законе іслам не згадваецца, але праваабаронцы і прадстаўнікі некаторых мусульманскіх арганізацый лічаць, што ён накіраваны супраць гэтай рэлігіі. Адна з асноўных мусульманскіх арганізацый Швейцарыі, Цэнтральны савет мусульман, назвала галасаванне «чорным днём». Усяго на рэферэндум было вынесена тры пытанні. Грамадзяне ўхвалілі заканадаўчую ініцыятыву аб забароне хаваць аблічча і пагадненне аб эканамічным партнёрстве з Інданезіяй, але адхілілі законапраект аб лічбавай ідэнтыфікацыі асобы ў інтэрнэце.



## Малайзійская кампанія запусціць лятучыя таксі




Малайзійская бюджэтная авіякампанія AirAsia плануе запусціць паветраныя таксі ўжо налета. Аб гэтым заявіў гендырэктар групы AirAsia Group Berhad Тоні Фернандэс, яго цытуе Bloomberg. У лятучых машынах будзе не менш як чатыры месцы, працаваць яны будуць як квадракоптар. Падрабязнасці сэрвісу Фернандэс не назваў, таксама як аб'ём выдаткаў на запуск новага бізнесу і кошт перавозак. Хто стане пастаўшчыком машын для сэрвісу, Фернандэс таксама не ўдакладніў. Прататыпы лятучых аўтамабіляў і таксі распрацоўваюць некалькі кампаній у розных краінах. Airbus правяла першыя поўнамаштабныя выпрабаванні свайго самалёта-таксі Alpha One ў лютым 2018 года. Нямецкі стартап Lilium стварыў уласную машыну, у якой 36 электрарухавікоў. У 2018-м прататып лятучага аўто паказаў Rolls-Royce, у 2019-м — нямецкі стартап Volocopter.

Тэхналогіі

# ПОПЫТ НА ЭЛЕКТРАКАРЫ РАСЦЕ

## У сувязі з гэтым спецыялісты ЭЗС папярэджваюць аб магчымых праблемах з зарадкай

**У лютым агульная колькасць зарэгістраваных электрамабіляў у нашай краіне перавысіла лічбу ў 2500 адзінак тэхнікі. Асаблівай папулярнасцю ў беларусаў сталі карыстацца бюджэтныя кітайскія электрамабілі, якія прыбываюць да нас у вялікай колькасці.**



Паводле інфармацыі ВА «Беларуснафта», па ацэнках аўтадылераў, у найбліжэйшы час у нашу краіну прыбудзе некалькі тысяч кітайскіх аўтамабіляў такіх марак, як BYD, Higer, BAIC, GAC і іншых. Аднак, акрамя прывабнай цаны і разнастайнасці мадэльнага шэрагу, уладальнікі менавіта кітайскіх электракараў сутыкаюцца з нечаканымі цяжкасцямі.

Кітайскія машыны маюць сваю спецыфіку і ў некаторых аспектах сур'ёзна адрозніваюцца і ад амерыканскіх, і ад еўрапейскіх аўтамабіляў. Перш за ўсё гэта датычыцца таго, што электракары ў Кітаі маюць уласны зарадны стандарт GB/T, адпаведнай інфраструктуры для якога ў нашай краіне няма. Канектары з зарадам еўрапейскага тыпу размешчаны ў краінах Заходняй Еўропы, Аўстраліі, Паўднёвай Амерыкі, некаторых афрыканскіх краінах, станцыі з такімі канектарамі ўстаноўлены ў тым ліку і ў Беларусі. Амерыканскі і азіяцкі кантыненты аснашчаны канектарамі зусім іншых стандартаў: у Амерыцы прыняты стандарт CCS type, у Кітаі — GB/T.

У такой сітуацыі на выручку аўтаўладальнікам прыходзяць пераходнікі. Аднак праз тое, што многія кіроўцы карыстаюцца несертыфікаванымі пераходнікамі, пры зарадцы могуць узнікаць сур'ёзныя праблемы: замыканне пры падключэнні да станцыі праз пераходнік можа прывесці да блакавання ці нават узгарання электрамабіля.

Спецыялісты нацыянальнага аператара сеткі ЭЗС Malanka адзначаюць: штомесяц у мабільнай праграме рэгіструюцца да 200 новых карыстальнікаў. Штодня на станцыях ажыццяўляецца ў сярэднім 250 зарадных сесій, а за два апошнія месяцы іх агульная колькасць перавысіла 15 000 сесій.

Выкарыстанне несертыфікаваных пераходнікаў прыводзіць да таго, што аўтаўладальнік не можа зарадзіцца: з 10 спроб больш за палову аказваюцца няўдалымі. Для таго каб пазбегнуць праблем, спецыялісты рэкамендуюць пераабсталяваць раз'ём на еўрапейскі тып на станцыях тэхабслугоўвання. Праўда, цана пераабсталявання пачынаецца ад 400 долараў.

Працэс пераабсталявання канектараў дазволіць пазбегнуць праблем з зарадкай на тэрыторыі не толькі Беларусі, але і ў іншых еўрапейскіх краінах, куды электраўладальнікі будуць выязджаць на сваіх аўтамабілях.

— У месяц з просьбай пераабсталяваць раз'ём да нас звяртаюцца ў сярэднім пяць чалавек. Высокі кошт паслугі асабліва кітайскіх электрамабіляў абумоўлены тым, што ў «кітайцаў» ёсць асаблівасці праграмнага забеспячэння. Нават калі кіроўца лічыць за лепшае адразу пасля куплі электракара карыстацца пераходнікам, то праз месяц-другі ён усё роўна звяртаецца з просьбай аб пераробцы, бо пераходнікі багатыя на праблемы пры зарадцы. Некаторыя ЭЗС проста не распазнаюць пераходнікі, што робіць зарадку немагчымай. Таксама пры карыстанні пераходнікамі, высокая верагоднасць памылкі пры зарадцы, калі станцыя проста блакуе электрамабіль. І разблакаваць яго не заўсёды атрымліваецца пры дапамозе адаптараў. Таксама выкарыстанне пераходнікаў накладвае абмежаванне на хуткасць зараду, — удакладняе **спецыяліст адной са сталічных СТА Яўген ШВЕД.**

Malanka, нацыянальны аператар сеткі ЭЗС, гатова аказваць садзейнічанне электрамабілістам. Так, **начальнік аддзела эксплуатацыі зараднай інфраструктуры ВА «Беларуснафта» Максім СУСАРЭНКА** прапануе кіроўцам, якія пераабсталююць раз'ём электракара на еўрапейскі стандарт, падчас куплі і тэст-драйва свайго электракара заехаць на станцыю Malanka. Там спецыялісты сеткі аддалена прасочаць за працэсам зарадкі аўто і дапамогуць разабрацца з зараднай сесіяй ад моманту запуску станцыі да моманту поўнай зарадкі батарэі.

Акрамя таго, спецыялісты рэкамендуюць пры куплі электрамабіля пераканацца ў тым, што яго зарадны раз'ём падыходзіць пад станцыі з канектарамі Еўрапейскага рэгіёна. У выпадку выкарыстання пераходнікаў рэкамендуецца пераканацца ў наяўнасці сертыфіката ад вытворцы, які пацвярджае яго працаздольнасць і бяспеку.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# На тыдні падмарозіць не на жарт

## Затое цяплець пачне ўжо з выхадных

**Сёлета сакавік у нашай краіне па кліматычных паняццях хутчэй адносіцца да зімовага месяца. За выхадныя ў многіх рэгіёнах утварылася снежнае покрыва. Па апошніх даных, таўшчыня снегу знаходзіцца ў межах ад 1 да 9 сантыметраў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Сёння ўдзень на большай частцы краіны абыдзецца без ападкаў, толькі па поўначы пад уплывам малярухомага франтальнага падзелу пройдзе кароткачасовы снег. Максімальная тэмпература паветра будзе ад мінус 4 градусаў па поўначы да 4 цяпла па паўднёвым захадзе Беларусі.

Дастаткова халодна будзе і ў чацвер. У гэты дзень надвор'е працягне вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халодным паветры. Будзе воблачна з праясненнямі і пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, удзень на захадзе краіны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 марозу, пры праясненнях — да мінус 12—17 градусаў. Удзень чакаецца ад 5 марозу па паўночным усходзе да 5 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

А вось у пятніцу, 12 сакавіка, надвор'е зменіцца. Атмасферны ціск пачне падаць, і з Заходняй Еўропы ў бок нашай краіны пачнуць рухацца цёплыя франтальныя раздзелы. Маразы прыкметна аслабнуць, а ўдзень у многіх раёнах установіцца адлiга. Павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. Паўсюдна пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, удзень з дажджом. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-заходні парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ящчэ 1—8 марозу, па ўсходзе пры праясненнях — мінус 9—12 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах — ад нуля да 1 цяпла. Удзень будзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, па паўднёвым захадзе — да плюс 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у другія выхадныя сакавіка пад уплывам цёплых вільготных акіянічных паветраных мас чакаецца адлiжнае надвор'е. Вясна паволі пачне забіраць уладу над надвор'ем у свае рукі, з ападкаў будуць ісці выключна дажджы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Факт

# НЕАБХОДНАЕ АДНАЎЛЕННЕ

## Больш за 1,1 тысячы пажылых людзей і інвалідаў аздаравілася ў санаторыях Мінпрацы пасля COVID-19

**З мая 2020 года ў чатырох санаторыях Мінпрацы і сацабароны для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў — «Бярэзіна», «Ясельда», «Белая вежа», «Вяжуці» — прайшлі далечванне і пазачарговае санаторна-курортнае аздараўленне 1102 пажылыя і інваліды, якія перанеслі асацыяваную з COVID-19 пнеўманію.**

«Бясплатна далячыцца на працягу перыяду да двух тыдняў можна было ў санаторыях «Бярэзіна» (з мая да ліпеня) і «Вяжуці «(з мая да жніўня). Этап далечвання прайшлі 475 пажылых грамадзян і інвалідаў. З ліпеня 2020 года непрацуючым ветэранам працы і інвалідам І і ІІ груп, якія перанеслі асацыяваную з COVID-19 пнеўманію, праз месяц пасля іх папраўкі дадзена права на пазачарговае санаторна-курортнае лячэнне ў санаторыях міністэрства. Такім правам ужо скарысталіся 627 пажылых грамадзян і інвалідаў», — удакладнілі ў Мінпрацы.

Непрацуючым інвалідам І і ІІ груп пуцёўкі даюцца бясплатна, ветэранам працы — па льготным кошце (як правіла, 15—20 % ад кошту пуцёўкі ў залежнасці ад даходу і сезона).

Дзеля атрымання пуцёўкі неабходна звяртацца да спецыялістаў прадстаўніцтваў Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва па месцы жыхарства. Пры гэтым, акрамя заявы, трэба прадставіць медыцынскую даведку пра стан здароўя, якая пацвярджае патрэбнасць у санаторна-курортным лячэнні, з указаннем звестак аб перанесенай пнеўманіі, асацыяванай з інфекцыяй COVID-19. Яшчэ патрабуецца копія працоўнай кніжкі, пенсійнага пасведчання або пасведчання інваліда.

У санаторыях Мінпрацы ёсць неабходная лячэбная база, якая ўдала спалучаецца з гаючымі прыроднымі ўмовамі, створана безбар'ернае асяроддзе. Пад кантролем медперсаналу праводзіцца комплекс фізіятэрапеўтычных працэдур. Аднаўленню пасля хваробы спрыяюць лячэбная і дыхальная гімнастыкі, прагулкі на свежым паветры, пяціразовае харчаванне, разнастайныя фітачаі і кіслародны кактэйль.

Санаторна-курортнае лячэнне арганізавана ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па прафілактыцы заносу ў санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі і распаўсюджвання там інфекцыі COVID-19.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Аты-баты

# ПАВЕСТКА НА ЗБОРЫ

**У Беларусі праводзіцца другі этап комплекснай праверкі гатоўнасці злучэнняў і воінскіх часцей Узброеных Сіл. Яго задача — высветліць здольнасць выканаць задачы па прызначэнні, паведаміла прэс-служба Міністэрства абароны.**

Да праверкі прыцягваюцца органы ваеннага кіравання аператыўнага і тактычнага ўзроўняў, а таксама вайсковыя часці. Плануецца прызваць каля тысячы чалавек з запасу.

— У рамках праверкі будзе ажыццяўляцца пастаўка мабілізацыйных рэсурсаў з ваенных камісарыятаў, камплектаванне ваеннай і спецыяльнай тэхнікай за кошт знятця транспартных сродкаў, якія знаходзяцца на працяглым захоўванні і атрымліваюцца з дзяржаўных органаў і арганізацый, атрыманне матэрыяльных сродкаў са складоў і баз захоўвання, — расказалі ў ваенным ведамстве.

У Міністэрстве абароны асобна адзначылі, што праверка дазволіць вызначыць узровень зладжанасці органаў кіравання, здольнасць камандзіраў кіраваць падначаленымі воінскімі часцямі і падраздзяленнямі ў розных умовах абстаноўкі.

Завяршыцца праверка правядзеннем тактычных вучэнняў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Будзь у курсе!

# У графіку руху цягнікоў часовыя змяненні

**У сувязі з планавым рамонтам чыгуначнага моста на ўчастку Мінск — Асіповічы ў перыяд з 15 да 19 сакавіка, з 22 да 26 сакавіка, з 29 сакавіка да 2 красавіка, з 5 да 8 красавіка адмяняецца пасажырскі цягнік № 744/743 міжрэгіянальных ліній бізнес-класа Мінск — Магілёў — Мінск адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 15.35 і адпраўленнем са станцыі Магілёў у 19.45.**

Таксама, як паведамляе прэс-цэнтр Беларускай чыгункі, у сувязі з рамонтам у названыя даты зменіцца расклад руху ў шэрагу цягнікоў міжрэгіянальных і рэгіянальных ліній бізнес-класа, маршруты якіх праходзяць па ўчастку Мінск — Асіповічы.

Акрамя таго, у названыя даты на гэтым жа ўчастку будзе адменена курсіраванне асобных цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа і гарадскіх ліній. Пры гэтым частка цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класа Мінск-Пасажырскі — Асіповічы будуць рухацца ў зносінах Мінск-Пасажырскі — Пухавічы. Падрабязная інфармацыя аб часовых змяненнях размешчана на станцыях і прыпыначных пунктах.

Беларуская чыгунка просіць пасажыраў улічваць гэтыя абставіны пры планаванні паездак. Больш падрабязную інфармацыю аб раскладзе руху цягнікоў можна даведацца на афіцыйным сайце Беларускай чыгункі www.rw.by, у афіцыйнай мабільнай праграме «БЧ. Мой цягнік», а таксама па тэлефоне 105 Кантакт-цэнтра Беларускай чыгункі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Галоўнае, каб кошт «квадрата» быў не большы за памер сярэдняй зарплаты

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Усе нашы арганізацыі падрыхтаваныя да будаўніцтва, так што спадзяёмся, што і сёлета мы таксама перавыканаем гэты план», — адзначыў начальнік упраўлення.

Кошт 1 квадратнага метра жылля, пабудаванага з дзяржаўнай падтрымкай у 2020 годзе, склаў 1053 рублі. «У нас была задача, каб гэты паказчык быў не вышэйшы, чым сярэдняя заработная плата. У планах на гэты год — 1152 рублі за 1 квадратны метр», — падзяліўся Аляксандр Аўраменка.

Як паведамлялася, у 2021 годзе на жыллёвае будаўніцтва ў краіне будзе накіравана 5 млрд 166,1 млн рублёў. На будаўніцтва інжынерной і транспартнай інфраструктуры для раёнаў жылой забудовы плануецца вылучыць 725,66 млн рублёў.

## У Мінску пабудуюць больш за 50 дамоў

У сталіцы ў 2021 годзе будуць уведзены ў эксплуатацыю 53 жылыя дамы агульнай плошчай 600 тысяч квадратных метраў. Гэта, вядома, менш, чым у мінулым годзе, але цалкам дастаткова, каб забяспечыць жыллём шматдзетных і іншых грамадзян, якія маюць на гэта вострую патрэбу.

Як паведаміў **намеснік старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Дзяніс НІКІЦІН,** у 2020 годзе ў Мінску ўведзены ў эксплуатацыю 62 аб'екты жыллёвага будаўніцтва агульнай плошчай каля 700 тысяч квадратных метраў, а гэта каля 11 тысяч кватэр. З іх з дзяржаўнай падтрымкай пабудавана 130 тысяч «квадратаў». Найбольшая колькасць новабудоўляў уведзена ў Кастрычніцкім раёне. «Узвядзенне жылля ў Мінску ажыццяўляецца як у індывідуальным выкананні, так і ў буйнапанэльным домабудаванні (БПД). Так, летась у канструкцыях БПД пабудавана каля 200 тысяч квадратных метраў, а ў індывідуальным — каля 500 тысяч квадратных метраў», — паведаміў Дзяніс Нікіцін.

Адным з прыярытэтаў у жыллёвым будаўніцтве, па словах намесніка старшыні камітэта, з'яўляецца забеспячэнне жыллём шматдзетных сем'яў. У мінулым годзе на паляпшэнне жыллёвых умоў было накіравана больш за чатыры тысячы шматдзетных сем'яў, а навасёламі стала 1,6 тысячы такіх сем'яў. Сярэдняя цана 1 квадратнага метра жылля з дзяржпадтрымкай па выніках мінулага года ў сталіцы — каля 1 200 рублёў.

«Што датычыцца планаў на 2021 год, то сёння ў Мінску ў стадыі будаўніцтва знаходзяцца 147 шматкватэрных жылых дамоў агульнай плошчай каля 1,7 млн квадратных метраў. З іх 42 аб'екты плошчай 500 тысяч квадратных метраў будуюцца камунальнымі прадпрыемствамі сталіцы, а 105 аб'ектаў плошчай 1,2 млн «квадратаў» — камерцыйнымі забудоўшчыкамі. Найбольш маштабнае будаўніцтва ў гэтым годзе ажыццяўляецца ў Кастрычніцкім, Маскоўскім і Цэнтральным раёнах. Сёлета ў Мінску запланаваны ўвод у эксплуатацыю некалькі жылых дамоў з дзяржаўнай падтрымкай — усяго 124 тысячы квадратных метраў», — адзначыў Дзяніс Нікіцін.

## Каля чатырох мільёнаў рублёў — на інфраструктуру ў Смалявічах

Аляксандр Аўраменка праінфармаваў, што ў гарадах-спадарожніках краіны будзе пабудавана 84 тысячы квадратных метраў жылля, у тым ліку ў Жабінцы Брэсцкай вобласці — 8 тысяч; Скідзелі Гродзенскай вобласці — 3,9 тысячы; у Мінскай вобласці: у Дзяржынску — 3,5 тысячы, Заслаўі — 1 тысяча, Лагойску — 5 тысяч, Смалявічах — 50 тысяч, Фаніпалі — 9,3 тысячы, Рудзенску — 3,3 тысячы квадратных метраў. На будаўніцтва будзе выдзелена 33,96 млн рублёў крэдытных рэсурсаў банкаў.

«У бягучым годзе Мінск ужо пералічыў у рэспубліканскі бюджэт на будаўніцтва сацыяльнай і інжынерна-транспартнай інфраструктуры чатыры мільёны рублёў. Гэтыя сродкі будуць накіраваны на будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў у горадзе-спадарожніку Смалявічы», — адзначыў Дзяніс Нікіцін.

Паводле яго слоў, у Мінску штогод скарачаюцца аб'ёмы будаўніцтва жылля і горад пераарыентуецца на будаўніцтва ў гарадах-спадарожніках. Ужо пачата асваенне другога жылога квартала ў Смалявічах. На дадзенай тэрыторыі будзе весціся будаўніцтва 19 жылых дамоў. Акрамя дамоў, там з'явяцца два дзіцячыя садкі, адна школа, будынак службы ЖКГ і інжынерна-транспартная інфраструктура. Прадстаўнік Мінгарвыканкама заўважыў, што ў 2021 годзе тут запланавана ўвесці ў эксплуатацыю тры жылыя дамы на 258 кватэр. Ужо цяпер ад чаргавікоў сталіцы пададзена 1,5 тысячы заяў.

Паводле яго слоў, летась у Смалявічах быў здадзены ў эксплуатацыю адзін шматкватэрны дом на 192 кватэры, пры гэтым тады было пададзена 759 заяў ад мінчан, якія стаяць на ўліку на паляпшэнне жыллёвых умоў. Ён нагадаў, што такія жыхары сталіцы будавацца ў гарадах-спадарожніках могуць незалежна ад даты пастаноўкі на ўлік. «Гэта сведчыць аб тым, што людзі зацікаўлены ў будаўніцтве дадзенага жылля і ўмовы ўзвядзення такіх дамоў з'яўляюцца для іх прывабнымі», — адзначыў намеснік старшыні камітэта.

Аляксандр Аўраменка падкрэсліў, што з Мінска ў гарады-спадарожнікі пераязджаюць тыя жыхары горада, хто стаміўся жыць у загазаваным месцы і аддае перавагу на «жывой прыродзе і вялікай прасторы».

## Першы электрадом «запрацуе» ў сталіцы ўжо вясной

Стартавы для Мінска электрадом размешчаны ў Маскоўскім раёне, у яго складзе 150 кватэр, і ён будзе ўведзены ў эксплуатацыю ў другім квартале гэтага года.



— Для мэт ацяплення, прыгатавання ежы, гарачага водазабеспячэння ў гэтым доме будзе выкарыстоўвацца электраэнергія, — расказаў Дзяніс Нікіцін. — Каля электрадома будзе пабудавана і асобна ўведзена ў эксплуатацыю электракацельня.

Электрадом будзе не адзіны. Пад Мінскам, у Мачулішчах, восьвось здадуць яшчэ адзін дом на электрычнасці. У Мінскай вобласці з улікам уводу ў эксплуатацыю БелАЭС горадабудаўнікі праектуюць электрадамы ў новых мікрараёнах.

— З пункту гледжання будаўнікоў, менавіта электрадамы выгадныя і для жыхароў, і для эканомікі краіны, — падкрэсліў Аляксандр Аўраменка. — У межах эксплуатацыі жылля электрадом выключае працёкі і аварыі на сетках, якія сілкуюць дом цяплом. Скароцяцца доўгія шляхі перадачы энергіі, напрыклад, ад ЦЭЦ да жылога дома. Для гэтага прапрацоўваюцца розныя варыянты: кацельня каля дома, якая працуе на электрычнасці, бойлеры ў кватэрах або ў падвале дома, якія будуць награваць ваду ў тым ліку для патрэб ацяплення. Можа быць і «сухое» ацяпленне, якое будзе ісці ад канвектара. Варыянтаў шмат.

Праўда, колькі менавіта будуць плаціць жыхары за электраэнергію, якая ў «жыроўцы» пацягне львіную долю выдаткаў, пакуль праліччваецца. Ды і аб варыянце «цёплая падлога» гутарка пакуль не ідзе.

Дзяніс Нікіцін адзначыў, што ў Мінску актыўна развіваецца будаўніцтва арэнднага жылля. У цяперашні час у стадыі будаўніцтва знаходзяцца два арэндныя дамы. Увод у эксплуатацыю аднаго з іх на 244 кватэры запланавалі на сакавік. «У мінулым годзе мы прыступілі да будаўніцтва яшчэ аднаго арэнднага дома на 130 кватэр, увесці яго ў эксплуатацыю плануем налета. Сёлета прыступілі да праектавання арэнднага жылога дома, ён будзе размешчаны ў Маскоўскім раёне. Цяпер распрацоўваецца праект, якім будзе вызначана колькасць кватэр і тэрміны яго ўводу», — распавёў Дзяніс Нікіцін.

## Спецыялісты ўпэўненыя — за электрадамамі, як і за электрамабілямі, — будучыня

Шматкватэрныя электрадамы пачалі будаваць з улікам уводу БелАЭС. Першы шматкватэрны электрадом у краіне быў здадзены ў 2019 годзе. Яго ўзвялі ў Баранавічах. Зараз на Брэстчыне ўжо дабудоўваецца пяты такі дом.

У краіне зацверджаны план па комплексным развіцці электраэнергетычнай сферы, згодна з якім да 2025 года таксама прадугледжана ўзвядзенне жылых электрапабудоў.

Галоўнае адрозненне электрадамоў ад іншых тыпавых «панэлек» у тым, што там няма звыклага цэнтральнага цеплазабеспячэння. Ацяпленне пакватэрнае, у кожнай ёсць ацяпляльны кацёл і бойлер. У ванных пакоях — электрарушнік-сушыльнік, пад вокнамі — радыятары, якія награваюцца электрычнасцю.

Самая галоўная перавага для ўладальнікаў кватэр у такіх дамах у тым, што ў жыхара ёсць магчымасць уключыць гарачую ваду або ацяпленне ў любую пару года. Ніякай сезоннасці ўключэння і адключэння гарачай вады там няма.

Як раней адзначалі ў Мінбудархітэктуры, на 2021-ы запланавана ўвесці ў эксплуатацыю больш за 200 тысяч квадратных метраў такога жылля. Аб'ёмы будаўніцтва будуць нарошчваць. Да 2025 года ўключна ў планах узвесці больш за чатыры мільёны квадратных метраў электрадамоў.

## З Мінска ў любы іншы рэгіён

Таксама прадстаўнік Мінбудархітэктуры расказаў аб запланаваных новаўвядзеннях у жыллёвым будаўніцтве. Не сакрэт, што грамадзяне, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, напрыклад, у буйных населеных пунктах ці ў абласных цэнтрах, могуць знаходзіцца на ўліку даволі працяглы час. Напрыклад, у Мінску людзі «стаяць у чарзе» дзесяцігоддзямі.

Для таго каб было магчыма рэалізаваць свае правы на жыллё, рыхтуюцца адпаведныя праекты нарматыўна-прававых актаў, цяпер яны праходзяць узгадненне. «Калі хтосьці стаіць пэўную колькасць гадоў на ўліку маючых патрэбу, напрыклад, у Мінску, і бачыць, што можна пабудаваць жыллё ў іншай вобласці, то можна падаць сваю заяўку менавіта ў гэты рэгіён, і там будзе будавацца жыллё з улікам колькасці такіх заявак. Гэта значыць, вобласць вызначыць у доме нейкі працэнт кватэр для такіх людзей», — растлумачыў Аляксандр Аўраменка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Трэці працоўны

# «Выбіраем студатрад!» стартаваў у Беларусі

### Рэспубліканскі прома-праект пад такой назвай пачаўся ва ўстановах адукацыі краіны

**«Выбіраем студатрад!» — гэта своеасаблівыя дні адчыненых дзвярэй у штабах студэнцкіх атрадаў БРСМ. Яны дазваляюць інфармаваць маладых людзей аб магчымасцях працаўладкавання ў трэцім працоўным семестры.**

У пачатку сакавіка даецца старт мерапрыемствам ва ўстановах вышэйшай адукацыі, а затым да прома-праекта далучацца штабы працоўных спраў устаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Кожны тыдзень у ВНУ і ССНУ ў пэўныя дні будуць арганізаваны рэкламныя кампаніі, што папулярызуюць студатрадаўскі рух.

Усе жадаючыя далучыцца да руху і папрацаваць летам у студэнцкіх атрадах змогуць запоўніць анкету на працаўладкаванне. Пры гэтым можна выбраць не толькі перыяд работы, але і пазначыць пажаданы профіль (будаўнічы, сельскагаспадарчы, педагагічны, сэрвісны, медыцынскі, экалагічны, вытворчы), а таксама ўдакладніць іншыя моманты: месца работы, заработная плата.

Праект «Выбіраем студатрад!» дапамагае планаваць працаўладкаванне маладых людзей і якасна каардынаваць гэтую работу. Зараз праводзіцца актыўная падрыхтоўка да трэцяга працоўнага семестра: ідзе планавая арганізацыя навучання камандзіраў і камісараў студэнцкіх атрадаў, працягваецца пошук запатрабаваных вакансій і працадаўцаў. Плануецца працаўладкаваць не менш за 25 тысяч байцоў. Падрыхтоўка да новага працоўнага семестра фактычна пачалася з канца мінулага года. У снежні ўжо былі праведзены заняткі і трэнінгі. У школе кіраўнікоў працоўных праектаў рэалізаваны «Зімовы маршрут». Па ім хлопцы і дзяўчаты «прайшлі» падчас зімовых канікулаў. Сёлета плануецца рэалізаваць яшчэ чатыры рэспубліканскія і міжнародныя працоўныя праекты. Гэта «Усебеларуская маладзёжная будоўля «Горад маладосці», «Атлант-2021», «Арляня» ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Камсамольскі» на базе Усерасійскага цэнтра «Арляня» сумесна з Расійскімі студэнцкімі атрадамі, а таксама будаўніцтва магістралі М1 (Беларусь) сумесна з Мабільнымі кадрамі Расіі».

У 2020 годзе сіламі ўсіх структур Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў працаўладкаваны 24 044 чалавекі ў складзе 1689 студэнцкіх атрадаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# РЭЧЫ, ЯКІЯ СТВАРАЮЦЬ НАСТРОЙ

## Беларускія рамеснікі адкрылі новы сезон кірмашом «Казюкі» ў Гродне

**Традыцыя цягнецца больш за 20 гадоў. Менавіта столькі мінула з таго часу, як знакаміты старажытны кірмаш зноў адрадзілі ў абласным цэнтры.**

Але само свята мае далёкую гісторыю і праводзіцца ў гонар заступніка рамеснікаў — святога Казіміра. Такія кірмашы ладзяцца ў Літве і Польшчы. «Казюкі» — вясновае свята, што абвяшчае пачатак новага сезона. Лічыцца, наколькі ўдала пройдзе першы дзень кірмашу, такі самы будзе і гандаль увесь год.

Падчас урачыстага адкрыцця адбылося пасвячэнне ў гільдыю рамеснікаў майстра лозапляцення. Для таго каб сезон быў удалы, удзельнікі кірмашу прайшлі праз браму ў выглядзе падковы. Імправізаваная сцэна таксама не пуставала. Адсюль гучалі беларускія песні ў выкананні народнага калектыву «Ніва».

А цяпер пройдзем па гандлёвых радах і паглядзім, што за тавар прывезлі майстры на самы папулярны кірмаш. Можна адразу сказаць, што ў трэндзе саламяныя вырабы. Майстар Вера Чурэйка з Іўя прапанавала прымераць саламяны капялюш. Цана 25-35 рублёў, у залежнасці ад спосабу пляцення.

— Я люблю рабіць менавіта капелюшы, нават Прэзідэнту падарыла, калі ён быў у нас. Вельмі добра капелюшы разбіралі ва Украіне, усе забралі, калі мы там былі на кірмашы, — расказала ўмеліца.

Украінскія майстры таксама прывезлі свой тавар у Гродна. Напрыклад, Міраслаў Паўлюк прэзентаваў шмат драўляных вырабаў і кошыкаў на любы густ. Пакупнікоў вабілі нізкія цэны і шырокі асартымент. Вясёлы майстар вельмі любіць Гродна. Лічыць, што ляжачы камень толькі мохам абрастае, таму трэба «каціцца» наперад. Вось чаму ён па магчымасці прыязджае сюды і абменьваецца вопытам з беларусамі. На кірмашы — вынік яго працы за паўгода.

Вочы разбягаюцца ад каляровых вырабаў. Чаго тут толькі няма! Керамічныя жбаны, дудачкі, вяночкі, драўляныя імянныя дошкі, лялькі, кошыкі, самаробная біжутэрыя, вязаныя вырабы і нават буслы. Драўляных птушак робіць Аляксандр Навіцкі з Карэліцкага раёна. Расказаў, што купляюць іх і турысты з Расіі, і беларусы, у якіх ёсць свая «фазэнда», свой падворак для ландшафтнага дызайну. Бяруць і каб дзіця нарадзілася, нават прыгаворваюць гэта, калі набываюць бусла. «Можа, яно так і працуе, я не ведаю, але душу ўкладваю дакладна», — усміхаецца Аляксандр.



Фота БелТА.

Таццяна з Гродна прапануе інтэр'ерныя лялькі. Гэта не для гульні, — папярэджвае яна. Сапраўды, работа тонкая, і дзіця такую ляльку хутка пашкодзіць, а кошт нятанны — 50 рублёў. Таму мяркуе, што яны будуць для ўпрыгажэння пакояў або для калекцыі. Дарэчы, адна з наведвальніц кірмашу купіла такую ляльку менавіта для папаўнення сваёй калекцыі.

А вось Таццяна Пілецкая з Санкт-Пецярбурга, якая родам з Гродна, у будучым спадзяецца браць удзел у беларускім кірмашы. Яна робіць рэчы з папяровай лазы, як сама прызналася, у авангардным стылі. Любіць спалучаць розныя матэрыялы, напрыклад, лазу і дрэва. Работа вельмі марудная і карпатлівая. Дарэчы, як і многае іншае, што робіцца ўручную. Гродзенскія майстры, на яе думку, вельмі разнапланавыя, але для прасоўвання свайго тавару варта займацца маркетынгам. Таццяна гатовая паспрыяць у гэтым.

Дзень падчас кірмашу быў хоць і сонечны, але марозны. Каваль Іван Перагінец дазволіў крыху пагрэцца каля горна. Пры жаданні ён мог вырабіць пакупніку нейкую простую рэч, напрыклад, цвік. Можна было такія рэчы набыць гатовымі. Вялікі цвік — 10 рублёў. За 20 — драўляная вешалка з кручкамі. Увогуле, у кавалёў зараз не самыя лепшыя часы. Для іх значную канкурэнцыю складаюць кітайскія загатоўкі, з якіх робяць псеўдакоўку. Праўда, заказы да майстроў паступаюць па коўцы парэнчаў, брам, агароджаў.


Фота Маргарыты УШКЕВІЧ.

У канцы спынілася каля вялікага прылаўка з меднай чаканкай. Як аказалася, гэтымі вырабамі займаецца адзіны ў Беларусі майстар Аляксандр Плістаў з Гомельскай вобласці. Для таго каб атрымаць такую карціну, медны лом расплаўляецца і пад уздзеяннем электрамагніту «садзіцца» на васковую матрыцу. Завяршальны этап — мастацкае афармленне з таніраваннем ці пакрыванне срэбрам. Былы «афганец», цяпер пенсіянер, ён чаканіць розныя выявы, у тым ліку святых. Дарэчы, благаславенне на гэтую работу ён атрымаў ад святара. Той параіў яму рабіць іконы з кіvotам, каб можна было іх пад шкло змяшчаць. Майстар кажа, што такія рэчы папулярныя ў расіян, але цікавяцца і беларусы.

Унікальныя рэчы прывезлі на кірмаш раённыя дамы рамёстваў. Напрыклад, у экспазіцыі з Мастоў прадстаўлены элементы дэкору, сплеценыя з травы і лазы.

— Сюды збіраюцца тыя неабыякавыя майстры, хто любіць гэтую рамесніцкую справу. На кірмаш прыехала каля 200 майстроў з сямі рамесніцкіх дамоў, прадстаўнікі ўсіх куткоў Беларусі. Гэты кірмаш дае падставу ўсвядоміць, наколькі нам важна захоўваць сваю родную спадчыну, здабыткі народных рамёстваў. Усе гэтыя рэчы ўнікальныя, таму што яны ў асноўнай большасці непаўторныя. Кожны можа знайсці тое, што захаваецца ў душы і будзе выклікаць добрыя ўспамін, — адзначыла **намеснік начальніка аддзела культуры Гродзенскага гарвыканкама Галіна ЯРЭМІНОВІЧ.**

Некаторыя наведвальнікі ніяк не маглі выбраць падарунак, настолькі тут усё ім падабалася. Наўрад ці хто пакінуў кірмаш без аніякай пакупкі. Вось і я не стала выключэннем. З вялікім задавальненнем набыла прыгожы шалік з воўны з шоўкам і некалькі керамічных кулонаў. Аўтарскія работы сапраўды асаблівыя. Ад іх не ўзнікае думкі, што грошы патрачаны дарма.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**


Фота БелТА.

# НАПЯРЭДАДНІ «ВЯЛІКАЙ ВАДЫ»

**Да веснавой паводкі ў рэгіёне традыцыйна рыхтуюцца па максімуме. Цяпер цяжка спрагназаваць, наколькі складанай будзе паводкавая сітуацыя на тэрыторыі вобласці, але падтапленні домаўладанняў ужо рэгіструюцца. Аб наяўнасці вады ў дамах паступіла каля 30 заяў ад домаўладальнікаў. Пакуль самым сур'ёзным можна лічыць становішча ў Петрыкаўскім раёне, дзе Прыпяць з прытокамі Случ, Убарць, Пціч традыцыйна адна з самых небяспечных у плане паводкі. На Петрыкаўшчыне ёсць верагоднасць падтаплення аўтадарогі. Між тым у Лоеўскім раёне на пойму выйшаў Дняпро, што таксама прыцягнае ўвагу ўсіх адказных структур і ведамстваў. На кантролі — гатоўнасць месцаў для магчымай эвакуацыі насельніцтва, стварэнне рэзерву харчавання ў праблемных раёнах, а таксама забеспячэнне спецтэхнікай.**

На абласной селектарнай нарадзе, якую правёў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ,** кіраўнік рэгіёна акцэнтаваў увагу на тым, што Гомельшчына павінна быць гатовая да ўсіх магчымых варыянтаў развіцця сітуацыі. Дробязяў у гэтай рабоце няма. Да таго ж многае будзе залежаць ад стану паводкі на рэках на тэрыторыі суседніх краін — Расіі і Украіны, адкуль можа прыйсці «вялікая вада». Як падкрэсліў Генадзь Салавей, гэты факт таксама неабходна абавязкова ўлічваць.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Найбольш значная нагрузка пры ліквідацыі наступстваў паводкі ў рэгіёне прыходзіцца на дзве службы — жыллёва-камунальную гаспадарку і ўпраўленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Па словах ратавальнікаў, незалежна ад паводкавых прагнозаў, Гомельскі гарнізон да праходжання паводкі гатовы ў поўным аб'ёме. Для прыняцця мер аператыўнага рэагавання збор і аналіз інфармацыі аб паводкавай сітуацыі традыцыйна ажыццяўляецца ў кругласутачным рэжыме. У выпадку неабходнасці для зніжэння наступстваў паводкі будуць задзейнічаны плавальныя сродкі, водаадводная, інжынерная і іншая спецтэхніка, а таксама арганізуецца комплекс мерапрыемстваў па часовым адсяленні насельніцтва з зон падтаплення і эвакуацыі сельскагаспадарчай жывёлы ў месцы для часовага размяшчэння.

— Для правядзення першачарговых ратавальных работ у паводкавы перыяд на тэрыторыі Гомельскай вобласці створаны пяць зводных атрадаў, якія гатовы да перадыслакацыі ў любы пункт вобласці і краіны, — адзначыў **начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ДЗІЧКОЎСКІ.**

Між тым, па даных філіяла «Гомельаблгідрамет» дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя», на гэты момант сітуацыя на вадаёмах вобласці спакойная.

— На пачатак бягучага тыдня на большасці рэк Гомельскай вобласці назіраецца рост узроўню вады з сутачнай інтэнсіўнасцю ад 1 да 10 сантыметраў. Толькі на рацэ Прыпяць, у раёне вёскі Чэрнічы, адзначаецца роўны ход, узровень вады не хістаецца, — растлумачыла **начальнік аддзела гідралогіі і аграметэаралогіі філіяла «Гомельаблгідрамет» Вольга КАЛУГІНА.** — На большасці рэк рэгіёна адзначаецца ледастаў з праталінамі, на асобных участках прытокаў Сожа і Прыпяці — забэрагі і рэдкі шугаход, некаторыя ўчасткі прытокаў адзначаных рэк поўнасцю ачысціліся ад лёду. Поўны ледастаў захоўваецца на рацэ Бесядзь у раёне населенага пункта Свяцілавічы. На поўме вада знаходзіцца на рацэ Дняпро каля горада Лоева, на Пцічы каля вёскі Першая Слабодка, на Убарці каля населенага пункта Краснабярэжжа, на Случы каля пасёлка Ленін.

Як адзначаюць спецыялісты «Гомельаблгідрамета», максімальны ўзровень вады вясновай паводкі на Гомельшчыне шмат у чым будзе залежаць ад умоў надвор'я. Калі ўначы будзе падмарожваць, а ўдзень — падтаваць, то, нягледзячы на багацце снегу, паводкавая сітуацыя мусіць працякаць спакойна.

Спадзявацца на падарункі надвор'я — не выйсце. У Гомелі на пасяджэнні камісіі па надзвычайных сітуацыях пры гарвыканкаме абмеркавалі пытанне праходжання вясновай паводкі. Вядома, што ўжо вызначаны месцы, дзе ў выпадку прыходу «вялікай вады» змогуць часова размясціцца грамадзяне, чые домаўладанні ў зоне рызыкі. Падчас работы назіральных камісій у адміністрацыях раёнаў Гомеля ўдакладняюцца спісы тых, каму можа спатрэбіцца адсяленне, наяўнасць на падворках грамадзян сельгасжывёлы і птушкі, вызначаецца, ці ёсць у людзей магчымасць самастойна выехаць на час падтаплення, калі спатрэбіцца. У Гомелі вызначаны месцы размяшчэння спецыяльных пастоў, дзе ў выпадку затаплення вуліц будуць кругласутачна дзяжурыць ратавальнікі, прадстаўнікі таварыства выратавання на водах, супрацоўнікі міліцыі. Вызначаны таксама месцы размяшчэння плавальных сродкаў і іншых неабходных у падобных сітуацыях рэчаў.

Між тым Гомельскае абласное ўпраўленне МНС арганізуе правядзенне тактыка-спецыяльных вучэнняў. Галоўная іх мэта — вызначыць гатоўнасць органаў кіравання, сіл і сродкаў раённага звяна да ліквідацыі надзвычайных сітуацый, звязаных з праходжаннем вясенняй паводкі. Месцам правядзення вучэнняў у рэгіёне абрана тэрыторыя каля паромнай пераправы Петрыкаў — Вялаўск. Паводле легенды, у выніку рэзкага павышэння ўзроўню вады ў Прыпяці адбыліся падтапленне шэрагу населеных пунктаў, разбурэнне палатна аўтамабільнай дарогі да паромнай пераправы, разбурэнне цела дамбы, якая абараняе населеныя пункты, ёсць пацярпелыя.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# НЕЙРАПЕДАГОГІКА, «ЭКА STEAM», АНГЛІЙСКІ ЛЕТНІК...

## Як настаўніцкія ініцыятывы знаходзяць падтрымку і ўвасабляюцца ў рэчаіснасць

**«Дзякуй вялікі! Для мяне быў вельмі важны напамін пра тое, што задача настаўніка — не толькі «даць дзіцяці інфармацыю рознымі цікавымі спосабамі», але і работа з асобай і над асобай. А я перыядычна пра гэта забываю», «Вы змаглі ахапіць неабсяжнае і раскласці па палічках тоны інфармацыі. Цяпер мой ход — пераварыць і вызначыць, дзе я хачу прымяніць тое, пра што даведалася, і зрабіць гэта», «Як важна памятаць, што я павінна бачыць не клас, як адно цэлае, а кожнага вучня як асобу», «...Сышла ў перазагрузку і пераасэнсаванне ўсёй сваёй дзейнасці, больш за тое, усяго жыцця». Так рэфлексавалі ўдзельнікі праекта «Нейрапедагогіка і педагогіка ў сучаснай школе». Ён стаў адной з 37 ініцыятыў, якія нарадзіліся ў выніку матывацыйна-навучальнага курса «Ад ідэі — да праекта».**




**Аліна ТОЛКАЧ (*злева*) і Аляксандра ГЛОД: «Як стварыць мадэль эфектыўнага ўрока з пункту гледжання навукі пра мозг? Давайце разбірацца...»**

### ФЕЕРВЕРК ІДЭЙ

Арганізавала курс каманда беларускіх педагогаў. Ён быў задуманы як частка праекта «PRAсоўванне адукацыйных ініцыятыў» з мэтай натхніць і матываваць настаўнікаў, даць ім веды па праектным менеджменце, камандаўтварэнні, маркетынгу і лідарстве.

— Так сталася, што вясной пандэмія аб'яднала нас усіх у анлайне, і дзякуючы праграме «Настаўнік для Беларусі», асацыяцыі «Адукацыя для будучыні», IT-кампаніі Vizor Games і неабыякавым настаўнікам мы арганізавалі пяць набораў на бясплатны дыстанцыйны экспрэс-курс «Падрыхтаваны да дыстанцыйнага навучання», дзе педагогаў навучалі выкарыстанню лічбавых інструментаў для арганізацыі анлайн-заняткаў, — расказвае **дырэктар школы LuCh Яўген ЛУФЕРЧЫК.** — Курс карыстаўся вялікім попытам, напрыклад, падчас другога набору, калі навучанне настаўнікаў прыпадала на школьныя канікулы, заяўкі падалі 2,5 тысячы чалавек. Але складаны навучальны год скончыўся, распачаліся летнія канікулы і... усе засумавалі, праўда, ненадоўга. Адпачываць на канікулах — не для нас. Сустрэліся, правялі мазгавы штурм, вынікам якога стаў праект «PRAсоўванне адукацыйных ініцыятыў». Заручыліся падтрымкай фонду «Новая школа», кампаніі EPAM і стартавалі ў жніўні.

— Апошнія гады я актыўна кантактую з настаўнікамі, таму ведаю і бачу, што ў іх ёсць шмат вельмі крутых ідэй, задумак, ініцыятыў, але для іх рэалізацыі не хапае «чароўнага штуршка», а яшчэ каманды аднадумцаў, падтрымкі, крыху экспертызы, і, галоўнае, веры ў сябе і ў тое, што атрымаецца. Дарэчы, курс таксама быў ініцыятывай і творчым памкненнем фантастычнай каманды настаўнікаў, — падкрэслівае **каардынатар праграмы «Настаўнік для Беларусі», член праўлення фонду «Новая школа» Алена МЕЛЬЧАНКА.**

На летні інтэнсіў «Ад ідэі да праекта» падалі заяўкі 320 педагогаў, якія прадстаўлялі 120 школ. З іх змаглі запрасіць толькі палову: перавагу аддавалі рэгіянальным школам, дакладна вызначанай матывацыі і камандным заяўкам. У пачатку жніўня курс стартаваў. Перад удзельнікамі выступілі 43 спікеры з самых розных сфер. Глабальнай задачай курса было прадставіць настаўнікам іншы погляд на праектаванне, характэрны для бізнесу, «запаліць» іх і натхніць.

У выніку 143 педагогі аб'ядналіся вакол 37 праектаў: сярод іх былі «Ліцэйскі медыяцэнтр», «Новыя тэхналогіі ў музейнай практыцы гімназічнага этнаграфічнага кутка «Пад страхою прадзеда», «Жывы музей: mast see», «Аратар на абцасах», «Электронны адукацыйны рэсурс «Стужка памяці», «Школа тынэйджараў. Прапампуй свае soft skills», «Самы разумны. Вучуся быць вучоным», «Чытанне ў новым фармаце» і іншыя. У фінал Эдутону (педагагічнага марафону. — **Аўт.**) выйшлі з іх 23. А грантавую падтрымку атрымалі пяць, у тым ліку і праект Аліны Толкач і Аляксандры Глод.

### АКНО МАГЧЫМАСЦЯЎ

**Аліна ТОЛКАЧ — псіхолаг і настаўнік англійскай мовы ў прыватнай школе «Альтэрнатыва», Аляксандра ГЛОД выкладае ў 115-й мінскай сярэдняй школе матэматыку.**

— Як зразумець, што адбываецца з дзіцем і чым яму дапамагчы? Гэтыя пытанні задаюць сабе штодня многія педагогі, — кажа Аліна. — Складанасці ў навучанні, адсутнасць увагі, немагчымасць сканцэнтравацца, адмаўленне, агрэсія, канфлікты... Што з усім гэтым рабіць? А эмоцыі? Як яны ўплываюць на навучанне? Ці ўмее педагог выяўляць свае эмоцыі і рэсурсна аднаўляцца? Паверце, што пра космас і жыццё ў акіяне мы ведаем значна больш, чым пра ўласны мозг. Таму мы вырашылі гэтыя праблемы ліквідаваць. І не толькі ўзброіць настаўнікаў неабходнымі ведамі па псіхалогіі, але і навучыць іх нейрапедагагічным прыёмам і гульням пры складанні ўрокаў, а таксама навучыць аказваць першую псіхалагічную дапамогу дзіцяці. Важна зразумець вучняў, іх цяжкасці і магчымасці. Гэта, у сваю чаргу, адкрывае акно магчымасцяў ужо для нас...

Увесь курс быў падзелены на пяць блокаў: «Псіхалогія развіцця» (развіццё псіхікі, крызісныя перыяды, фарміраванне асобы і запуск вышэйшых псіхічных функцый і працэсаў), «Эмацыянальны інтэлект» (сувязь розуму і цела, прыняцце і кіраванне сваімі эмоцыямі, рэфлексія і эмпатыя, распазнаванне эмоцый і прагназаванне паводзін), «Нейрапедагогіка» (асноўныя этапы развіцця мозга чалавека, кагнітыўная псіхалогія і педагогіка ў адукацыі), «Настаўнік. Вучань. Першая псіхалагічная дапамога» і «Прыёмы і тэхнікі нейрапедагогікі на ўроках». Курс чытаецца анлайн. Было сфармулявана дзесяць ідэй: стварыць мадэль эфектыўнага ўрока з пункту гледжання навукі пра мозг, сабраць скарбонку прыёмаў першай псіхалагічнай дапамогі, стварыць інфаграфіку-падказку, як дзейнічаць у практычных сітуацыях, нагадаць, што дзіця — таксама чалавек і іншыя.

У Telegram была створана група анлайн-падтрымкі ўдзельнікаў (у ёй цяпер 57 чалавек з Беларусі, Расіі, Украіны і нават Іспаніі), там адбываецца абмен важнай інфармацыяй і новымі ідэямі па блоках праекта, забяспечваецца зваротная сувязь, прапануюцца творчыя дамашнія заданні для самаразвіцця. Мы прайшлі ўжо тры блокі. Натуральна, што блок, прысвечаны нейрапедагогіцы, аказаўся пакуль самы складаны.

Нейрапедагогіка, або адукацыйная нейранавука, аб'ядноўвае кагнітыўную нейранавуку, нейрабіялогію развіцця, педагагічную псіхалогію, адукацыйныя тэхналогіі і педагогіку. Яна павінна даць адказ на пытанне: як зрабіць адукацыйны працэс эфектыўным? Некаторыя слухачы скардзіліся, што тэарэтычнай інфармацыі вельмі шмат, яе складана ўспрымаць, але пагадзіліся, што без ведання тэорыі ніяк не абысціся.

І хоць курс яшчэ выкладаецца, Аліна і Аляксандра ўжо плануюць пасля яго завяршэння правесці аналіз і запусціць другі набор. Кажуць, што зараз ім патрабуецца юрыдычная кансультацыя па далейшым развіцці праекта.

### АД ЭКАМАНІТОРЫНГУ ДА ЭКАРАМЁСТВАЎ

Сярод пераможцаў Эдутону аказаўся і праект па стварэнні на базе бабруйскай сярэдняй школы № 34 экалагічнага цэнтра «ЗАОДНО». У каманду аб'ядналіся чатыры педагогі гэтай установы: **Людміла КРЫЛОВА (настаўнік беларускай мовы), Святлана ЗДАРАНКОВА (настаўнік фізікі), Вольга КУЛАКОЎСКАЯ (настаўнік біялогіі) і намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Ганна КЛІМЯНКОВА.**

— Для нас вельмі актуальная праблема выхавання выпускнікоў з развітымі экалагічна дружалюбнымі паводзінамі. Прыроду трэба не проста любіць, а свядома паважаць і шанаваць. Сучасная экалагічная сітуацыя патрабуе актыўнага стаўлення да праблем навакольнага асяроддзя і экалагічнага выхавання. Экакультура распачынаецца з кожнага з нас, — разважае Людміла Крылова. — Дзякуючы нашаму ўдзелу ў курсе «Ад ідэі — да праекта» ў лістападзе адбылося афіцыйнае адкрыццё цэнтра, але экалагічны сезон распачаўся для нас значна раней. Вучні школы сталі ўдзельнікамі акцый «Дапамагаю сабе і рацэ», «Чысты лес», «Зялёная зона», «Шкодныя расліны», паўдзельнічалі ў квэст-гульні «Экалагічная кругасветка». Каманда арганізавала экскурсіі «Экасістэмы Заходняга мікрараёна», «Бабруйск запаведны. Чырвоная кніга», серыю навучальных віктарын «Сёння зберажэш — заўтра спатрэбіцца», «Экалогія вакол нас. Таксічныя рэчывы», «Адходы ў даходы». І малодшыя вучні, і старшакласнікі, і нават супрацоўнікі школы актыўна далучыліся да акцыі «Новае жыццё ўзамен на закруткі» (пластыкавыя накрыўкі, якія закручваюцца) — сабралі вялікую іх колькасць і перадалі валанцёрам.



Паралельна з традыцыйнымі мерапрыемствамі экалагічнай накіраванасці ў экацэнтры ўкараняюцца і новыя кірункі, такія, напрыклад, як «Эка HAND MADE» . У рамках апошняга ўжо прайшлі майстар-класы «Лялька-мотанка», «Ткацтва», «Катанне грамнічнай свечкі». Трэба заўважыць, што катанне свечкі з натуральнага воску — адна з рытуальных традыцый свята. Воск для Грамніц збіралі загадзя, а выраблялі іх у апошнюю перад святам суботу. Так выйшла і ў нас. Удзельнікі майстар-класа прызналіся, што пах праполісу, цеплыня рук і шчыльнае кола ўдзельнікаў — менавіта тое, чаго так не хапала ў сцюдзёныя лютаўскія дні.

Што наперадзе? Дзякуючы падтрымцы EPAM і асацыяцыі «Адукацыя для будучыні» ў цэнтры будуць развівацца такія кірункі, як «Эка STEAM» (праектная дзейнасць: дакладныя навукі плюс экалогія)» і «Экаманіторынг». У школе ўжо прайшлі канікулы «Эка STEAM. Крыніцы энергіі», наперадзе чакаюць канікулы «Эка STEAM. Вымяральныя прыборы» і «Эка STEAM. Экалагічны маніторынг». Дзякуючы дапамозе Цэнтра экалагічных рашэнняў у школе фарміруецца адпаведнае тэматычнае інфармацыйнае асяроддзе. «Мы вельмі любім свой праект за яго шматвектарнасць. Калі не працуе адзін напрамак, можна пераключыцца на іншы», — канстатуе Людміла Крылова.

### З НАСТАЎНІКА — У ВАЖАТЫЯ

Напэўна, самым масавым праектам па колькасці педагогаў, якія да яго далучыліся, стаў летнік «English BY camp». Яго развіваюць 11 энтузіястаў з Мінска, Мазыра, Слуцка, Пружан, Гродна і Прылук. Англійская мова — значна больш, чым вучэбны прадмет, гэта важны інструмент для кантактаў, сцвярджаюць яны, але, каб матываваць навучэнцаў, трэба стварыць моўнае асяроддзе. Англамоўны летнік якраз і дапамагае дзецям усвядоміць, навошта яны вывучаюць на ўроках англійскую мову. Апошняя засвойваецца там не як прадмет. Зносіны на замежнай мове напоўненыя сэнсам. Пры пагружэнні ў моўнае асяроддзе знікае псіхалагічны бар'ер — страх зрабіць памылку ў гутарцы.

Аўтары імкнуцца натхніць і заразіць сваёй ідэяй іншых педагогаў. Каб летнік не ператварыўся ва ўрок, стаіць задача — змяніць настаўніцкае мысленне на важацкае. Лінгвістычны лагер — зусім не школа, хоць і арганізуецца ў яе сценах.

Каманда праекта займаецца напісаннем гатовых праграм тэматычных лагерных змен, правядзеннем важацкіх трэнінгаў для настаўнікаў і падтрымкай калег падчас правядзення летнікаў. Грант было вырашана перадаць тым яе членам, якія працуюць у дзяржаўных установах. Грошы былі падзеленыя пароўну паміж чатырма школамі — у Слуцку, Гродне, Мазыры і Прылуках — і выкарыстаны на закупку прынтараў, ламінатараў, паперы і іншых матэрыялаў, якія спатрэбяцца настаўнікам пры правядзенні школьных лагераў. У верасні-кастрычніку была напісана тэматычная праграма Camp Travel, а ў лістападзе яна была апрабаваная ў школах, дзе працуюць члены каманды, атрымала добрыя водгукі. У снежні і студзені кіпела работа над новай тэматычнай праграмай Camp Jobs. У сакавіку і маі пройдуць чарговыя важацкія трэнінгі, каб падрыхтаваць кадры для летнікаў на вясенніх і летніх канікулах. Вясной будуць арганізаваныя як анлайн, так і афлайн-летнікі. У больш аддаленых планах — стварэнне калекцыі гатовых праграм для правядзення летнікаў, з якіх кожны настаўнік зможа выбраць тыя, што падыходзяць яму. З часам мадэль англійскага школьнага лагера можна будзе адаптаваць і выкарыстаць для школьнага лагера на іншай замежнай мове.

У рамках гэтага праекта нарадзілася новая ініцыятыва Pen Friend Project. Навучэнцы робяць, падпісваюць і адпраўляюць паштоўкі сваім аднагодкам — такія своеасаблівыя генератары добрага настрою, цікавыя і пазітыўныя пасланні. Мэта — павіншаваць на англійскай мове незнаёмых хлопцаў і дзяўчат з надыходзячымі святамі. Кожны месяц — новы раўнд, новая тэма і новая школа-партнёр. Пагадзіцеся, што ў лічбавым свеце такі спосаб кантактавання для дзяцей, якія не прывыклі бегаць да паштовай скрыні, — «экзотыка», асабліва вітаюцца паштоўкі, зробленыя ўласнымі рукамі. Ужо прайшло два раўнды, у якіх паўдзельнічалі 390 вучняў з 32 школ.

Асноўным крытэрыем падбору партнёраў быў узрост дзяцей. Таксама ўлічваліся іх месца пражывання (пажадана, каб яны былі з розных рэгіёнаў) і колькасць вучняў, гатовых перапісвацца. «Магчыма, у чымсьці падбор партнёраў быў не ідэальны, але што ў нашым жыцці ідэальнае? А паспрабуйце зрабіць ліманад з тых лімонаў, якія ў нас ёсць», — жартуюць арганізатары і радуюцца, што такім чынам ім удалося уцягнуць дзяцей у дзейнасць на англійскай мове.

У праекта «English BY camp» ёсць свае старонкі ў сацыяльных сетках Facebook і «УКантакце». Там можна назіраць за тым, што робяць калегі, задаваць пытанні, дзяліцца сумненнямі і чаканнямі. Распачынаць новае — страшна, але калі ёсць падтрымка аднадумцаў, то ўсё нашмат прасцей. Разам усё атрымаецца!

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

# «БУДУЧЫ ПРЫРОДНЫМ БЕЛАРУСАМ...»

## Чым мы абавязаны Яўхіму Карскаму

**Энцыклапедыст, заснавальнік беларусазнаўства, навуковага айчыннага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фальклярыст, дыялектолаг, славіст, адзін з аўтараў статута Інстытута беларускай культуры, кіраўнік камісіі па стварэнні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, педагог і рэктар Варшаўскага ўніверсітэта, акадэмік расійскай і чэшскай Акадэмій навук, дырэктар Музея антрапалогіі і этнаграфіі... Заслугі Яўхіма Карскага можна пералічваць доўга. Навуковая спадчына Я. Ф. Карскага — 1052 асабістыя працы і 18 публікацый у суаўтарстве. І як заўважыла падчас «круглага стала», прысвечанага 160-годдзю выдатнага вучонага і 100-годдзю Інбелкульта, загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі Вераніка Курцова, якія б яго працы мы ні называлі, усе яны вельмі каштоўныя не толькі для нацыянальнага мовазнаўства, але і для ўсёй нацыянальнай культуры.**

### НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

— Навуковая спадчына Карскага, яго фундаментальныя працы, стварэнне Інстытута беларускай культуры, а пасля на яго базе — Нацыянальнай акадэміі навук, — гэта тыя важныя вехі, якія забяспечылі развіццё беларускага мовазнаўства, апісанне сістэмы беларускай мовы і вывядзенне яе да канца XX стагоддзя на ўзровень высакаразвітай літаратурнай мовы, якая можа паспяхова абслугоўваць розныя сферы жыцця грамадства. Усё гэта дазволіла беларускай мове стаць дзяржаўнай у нашай краіне і заняць месца ў славянскай і культурнай прасторы, — заўважыў **акадэмік Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ.**

За тыя сто гадоў, што прайшлі з часу напісання Карскім «Беларусаў», гуманітарная навука назапасіла каласальны досвед. Але, як заўважыў дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Іван Саверчанка, і сёння ніводзін даследчык у галіне мовазнаўства і літаратуразнаўства і нават сумежных дысцыплін не можа абысціся без напрацовак Яўхіма Карскага. Яго работы дапамагаюць фарміраваць мысленне чалавека, асобу навукоўца.

Не трэба забывацца, што ў другой палове XIX стагоддзя, калі Карскі пачынаў даследаванні, нашы землі знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі і тагачасная навука афіцыйна не прымала самастойнасці існавання беларусаў як асобнага народа. Менавіта працы Яўхіма Фёдаравіча ляглі ў падмурак вывучэння беларускай мовы.

Яго манаграфія «Обзор звуков и форм белорусской речи» стала першым сістэмным даследаваннем такога кшталту. «Будучы прыродным беларусам, атрымаўшы выхаванне і адукацыю ў асяроддзі беларусаў, значыць, з самага дзяцінства да апошняга часу знаходзячыся амаль толькі ў беларускім асяроддзі, аўтар набыў некаторую вопытнасць у беларускіх гаворках, якую потым падмацаваў знаёмствам з запісанымі творамі беларускай мовы, — пісаў у прадмове да сваёй навуковай працы Яўхім Карскі. — Але чым больш даводзілася знаёміцца з імі, тым часцей кідалася ў вочы нездавальняльнасць запісу гэтых твораў; зусім ненавуковая, а часта нават зусім скажоная перадача гукаў беларускіх. Прычына такой бязрадаснай з'явы зусім зразумелая. Браліся за вывучэнне беларускай мовы людзі збольшага толькі павярхоўна знаёмыя з ёй, тыя, хто загадзя склаў пра яе скажоныя меркаванні... Што ж датычыцца навуковых даследаванняў па беларускай мове, то іх, можна сказаць, яшчэ не існуе...» Гэта 1885 год, праца напісана і выдадзена Карскім, калі ён навучаўся ў Нежынскім гісторыка-філалагічным інстытуце. Малады даследчык акрэсліў тэрыторыю рассялення беларусаў, вылучыў асноўныя дыялекты беларускай мовы, апісаў яе спецыфічныя рысы.



Наогул пытанням беларускага мовазнаўства вучоны аддаў амаль паўстагоддзя. Кожны тэзіс ён падмацоўваў фактамі. Для гэтага перачытаў і прааналізаваў неверагодную колькасць крыніц, прычым імкнуўся працаваць з арыгіналамі пісьмовых помнікаў. Даследаваў скарбы царкоўнай кніжнасці і духоўнай літаратуры, прысвяціў дысертацыю перакладам Псалтыра на беларускую мову, якія рабіліся на працягу XV—XVII стагоддзяў, дзе звярнуў увагу на тое, што калі такія папулярныя кнігі, па якіх раней вучыліся чытаць, з царкоўнаславянскай мовы былі перакладзены на старабеларускую — гэта найлепшае сведчанне важнасці і запатрабаванасці мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Яўхім Фёдаравіч — заснавальнік беларускай палеаграфіі. У сваіх працах ён вызначыў асноўныя заканамернасці змен у абрысах кірылічных літар у старабеларускім пісьменстве на працягу XIV—XVII стагодзяў, правёў вялікую пошукавую работу і ажыццявіў палеаграфічны аналіз шматлікіх унікальных тэкстаў. Каб вывучыць старадрукі і рукапісы, ездзіў у Варшаву, Кіеў, Маскву, Санкт-Пецярбург і іншыя гарады. Ён быў першым беларускім літаратуразнаўцам, прааналізаваў усе віды і жанры старога беларускага пісьменства, глыбока вывучаў летапісы, знаёміўся з творчасцю пісьменнікаў, якія тварылі ў пачатку XX стагоддзя.

### РЭВАЛЮЦЫЯ

Карскі шмат падарожнічаў па Беларусі, праводзіў палявыя даследаванні, занатоўваў фальклор і моўны матэрыял. Яго паездкі па памежных тэрыторыях мелі яшчэ адну практычную мэту — вызначыць межы рассялення беларускага этнасу і тэрыторыю пашырэння беларускіх гаворак. Асновай для вывучэння граніц этнічнай беларускай тэрыторыі Карскі лічыў выключна мову: «Навука валодае помнікамі матэрыяльнай археалогіі, данымі народнага побыту і асабліва багаццямі мовы... Далей за мову не пашыраецца ніводная з крыніц». Уласна кажучы, і сёння яго даследаванні не трацяць актуальнасці. Узрастае роля беларускай мовы як фактару адзінства і яднання нацыі.

Яго фундаментальная праца «Беларусы» — а гэта тры тамы, кожны па некалькі частак (у сукупнасці сем кніг) — да нашага часу застаецца найбуйнейшым даследаваннем у галіне беларусістыкі. У выданні ён апісаў асаблівасці беларускай мовы, вуснай народнай творчасці, пісьменства, культуры і гісторыі беларускага народа. Акрамя работы непасрэдна з літаратурнымі помнікамі, вучоны прагледзеў безліч работ розных даследчыкаў, фальклорна-этнаграфічных запісаў XIX—пачатку XX стагодзя і, галоўнае, удзяляў увагу вывучэнню жывой беларускай мовы ва ўсёй яе разнастайнасці.

**І сёння ніводзін даследчык у галіне мовазнаўства і літаратуразнаўства, і нават сумежных дысцыплін не можа абысціся без напрацовак Яўхіма Карскага. Яго работы дапамагаюць фарміраваць мысленне чалавека, асобу навукоўца.**

Наогул, такіх грунтоўных даследаванняў у галіне вывучэння славянскіх народаў яшчэ не было, ды і амаль не створана да нашага часу. Карскі паказаў, што беларуская мова роўная сярод іншых славянскіх моў, мае свае адметныя рысы і гісторыю развіцця. Для таго часу такая заява была рэвалюцыйнай.

У выніку шматлікіх экспедыцый (па падліках навукоўцаў, Карскі пабываў больш чым у ста пунктах) былі створаны дзве карты, якія ён змясціў у першым томе «Беларусаў» — «Этнаграфічная карта беларускага племені» і «Этнаграфічная карта беларускага племені. Беларускія гаворкі». На другой адлюстравана тэрыторыя пашырэння разнастайных фанетычных з'яў беларускай мовы і зроблена класіфікацыя беларускіх дыялектаў. З гэтага пачалася новая галіна ў беларускім мовазнаўстве — лінгвагеаграфія.

Да таго ж акадэмік пакінуў праграму для наступных даследчыкаў. У першым томе «Беларусаў» ён гаварыў, што неабходна выдаць слоўнік беларускай мовы. Яго планы па стварэнні слоўнікаў жывой дыялектнай мовы і старабеларускай мовы не былі спраўджаны. І справа не толькі ва ўзросце і здароўі вучонага, за савецкай уладай пачаліся цкаванні акадэміка. Яго звольнілі з пасады прафесара Мінскага педагагічнага інстытута як чалавека з нядобранадзейнай «палітычнай фізіяноміяй». У 20-х гадах у часопісах быў надрукаваны шэраг гнеўных артыкулаў, у тым ліку і рэцэнзія на III том «Беларусаў», дзе нейкі Уладзіслаў Дзяржынскі (Чаржынскі) нават абвінаваціў акадэміка ў «павярхоўнасці» ведання сучаснай беларускай літаратуры...

Хоць адукаваныя людзі высока цанілі Яўхіма Карскага. Распрацоўкі вучонага былі выкарыстаны слоўнікавай камісіяй Інбелкульта пры падрыхтоўцы праектаў па сістэматызацыі беларускай лексікі. Сцяпан Некрашэвіч прапаноўваў акадэміку ўзначаліць Інбелкульт, выкладаць у БДУ.

Акрамя таго, і пытанні аб вызначэнні граніц нашай краіны, этнагенезу народа таксама немагчыма было б вырашыць без работ Карскага.

### АСЭНСАВАННЕ

Характарызуючы навуковую спадчыну «акадэміка № 1», Міхаіл Булахаў пісаў: «У працах Я. Ф. Карскага лінгвіст знойдзе ўзорнае апісанне стараславянскай, старажытнарускай і сучасных славянскіх моў; палеограф — сістэматычнае даследаванне старажытнай гісторыі славянскай пісьменнасці і яе трансфармацыю ў пазнейшую эпоху; літаратуразнавец — яскравую карціну развіцця вуснай народнай творчасці і мастацкай літаратуры беларусаў са старажытнасці да першай чвэрці XX ст. уключна». Менавіта Міхаіл Булахаў вельмі шмат зрабіў у галіне даследавання спадчыны акадэміка, ён вёў актыўную перапіску з зяцем Карскага — Віктарам Баркоўскім. Апошні ў адным з допісаў прызнаваўся, што ўвайшоў у сям'ю акадэміка, калі марыў аб фізіка-матэматычным факультэце ўніверсітэта ці аб тэхнічнай ВНУ. Але сустрэча з Яўхімам Фёдаравічам, размовы аб беларускай мове і літаратуры і палымяная перакананасць вучонага, што філолаг патрэбны Радзіме не менш за іншага спецыяліста, абумовілі тое, што Баркоўскі абраў шлях мовазнаўца.

У 80-х гадах навукоўцы не раз уздымалі пытанне аб тым, што імя Карскага павінна быць дадзена вышэйшым навучальным установам. Тады ж з'явілася ідэя правядзення Карскіх чытанняў, з 1991 года яны сталі міжнароднымі, і гэта сведчыць пра значнасць вялікай і рознабаковай навуковай спадчыны акадэміка не толькі для беларусаў.

**Не трэба забывацца, што ў другой палове XIX стагоддзя, калі Карскі пачынаў даследаванні, нашы землі знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі і тагачасная навука афіцыйна не прымала самастойнасці існавання беларусаў як асобнага народа. Менавіта працы Яўхіма Фёдаравіча ляглі ў падмурак вывучэння беларускай мовы.**

Праўнук славутага акадэміка Аляксандр Карскі таксама шмат часу правёў у архівах, даследуючы жыццё свайго продка. Унікальныя фатаграфіі, дакументы, звесткі ён падаў у двух тамах, прысвечаных біяграфіі Яўхіма Карскага. Гэтая работа — яшчэ адзін ключык да разумення асобы вучонага, яе станаўлення, тут багата звестак пра ранні перыяд жыцця, дзяцінства Яўхіма Фёдаравіча, мясціны, у якіх ён пабываў.

Не ўся спадчына акадэміка была шырока даступная для навуковай супольнасці, што выпраўляе яшчэ адно новае выданне, падрыхтаванае навукоўцамі, — «Жыццё і дзейнасць акадэміка Я. Ф. Карскага. Зборнік дакументаў і матэрыялаў». Тут змешчана таксама перапіска вучонага са знанымі дзеячамі таго часу па пытаннях гісторыі і культуры, напрыклад, лісты, дзе Янка Купала просіць Яўхіма Фёдаравіча, каб той «звярнуў увагу на пераклад «Песні аб паходзе Ігара», і адказ, у якім вучоны ўхваляе работу пісьменніка. Таксама тут змешчаны дакументы сям'і, а з дзённіка, што Яўхім Карскі вёў падчас камандзіроўкі 1918—1920 гадоў, мы даведваемся, з якімі праблемамі давялося сутыкнуцца знакамітаму вучонаму і ў якім запусценні ён заспеў гарады падчас змены ўлад. «Вясной 1918 года ў Петраградзе асабліва моцна даў сябе адчуваць голад. Хлеба сталі адпускаць па 1/4 фунта, затым па 1/8 на чалавека, а здараліся дні, што і такіх водпускаў не было. Бульбы таксама не было, а іншыя прадукты сталі паступова знікаць. Асобе, якая жыве толькі на сваё дараванне, абсалютна стала немагчыма існаваць. Мы з жонкай і дачкой моцна схуднелі... Раз нават я страціў прытомнасць на вуліцы. Зразумела было, што далей заставацца ў Петраградзе немагчыма». У Нежыне яго засмучае заняпад інстытута, у якім ён раней вучыўся. У Варшаве прафесар застае сваю кватэру разнесенай і разрабаванай, важныя дакументы былі раскіданыя па падлозе, а значная частка кніг распрададзена букіністам... А таксама з дзённіка мы бачым, як у Мінску, нягледзячы на ўсе нягоды і пошукі розных падпрацовак, каб элементарна здабыць харчаванне, вучоны не перастае дбаць пра асвету і навуку.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# СЛАНЕЧНІКАВЫ АЛЕЙ: ЯК ВЫБРАЦЬ І ЗАХОЎВАЦЬ

**Чым адрозніваецца нерафінаваны сланечнікавы алей ад рафінаванага? А таксама як правільна выбраць і захоўваць гэты прадукт?**



Па словах экспертаў, калі смажыць на нерафінаваным алеі, то ўсё, што надае яму пах, колер і смак, — прыродныя араматызатары, вітаміны, мінералы, кіслоты — пры нагрэве хутка разбураюцца, а такі алей «прыпраўляе» ежу канцэрагенамі і транстлушчамі. Таму раз і назаўсёды трэба запомніць, што сланечнікавы рафінаваны алей — для высокіх тэмператур, а любы нерафінаваны — хоць сланечнікавы, хоць аліўкавы — для салатаў, соусаў і заправак.

Амаль усе ведаюць, што сярод нерафінаванага аліўкавага алею найбольш карысны той, на этыкетцы якога напісана Extra virgin. Так можна маркіраваць толькі алей першага халоднага адціскання, гэта значыць самага камфортнага для нашага арганізма.

Але і сланечнікавы нерафінаваны алей таксама бывае больш і менш карысны. Сланечнікавы, як і любы іншы алей, здабываюць двума спосабамі. Самы распаўсюджаны — экстракцыя. Семачкі чысцяць, здрабняюць і заліваюць растваральнікамі. Атрыманую сумесь сепарыруюць, дыстылююць, апрацоўваюць парай. Атрымліваць алей так, нягледзячы на шматлікія маніпуляцыі, вельмі выгадна, таму што з семкі адціскаецца амаль усё, а ўсе сляды нафтапрадуктаў выдаляюцца. Вось толькі з-за высокіх тэмператур і агрэсіўнай «хіміі» знікае амаль уся біялагічная карысць. На ўпакоўках з такім нерафінаваным алеем ніколі не напішуць, па якой методыцы ён атрыманы.

А калі алей здабыты халодным прэсаваннем, то гэта трапіць на этыкетку абавязкова. Бо такі прадукт — проста скарбніца вітамінаў. Семачкі або аліўкі толькі чысцяць, здрабняюць і прэсуюць. Ніякага награву — толькі механічная чыстка ад асадку. Каштуе яно, вядома, даражэй, бо з семак такім асцярожным экалагічным спосабам можна здабыць толькі 20 % алею, а заплацяць даводзіцца за ўсе сто.

Свежасць — гэта адзін з галоўных крытэрыяў усіх раслінных алеяў. Але складанасць у тым, што калі хлеб чарсцвее, малако пракісае і піць яго немагчыма, то псаванне прадукту не такое відавочнае — і цвіллю рэдка пакрываюцца, і змену смаку не кожны заўважаць. Таму вельмі важна выкарыстоўваць алей у рамках тэрмінаў яго прыдатнасці.

Пасля адкаркоўвання нерафінаваны сланечнікавы алей прагаркае ўсяго за месяц. І нават калі на выгляд і смак ён здаецца нармальным, то лепш яго не ўжываць, бо ўнутры ўтварыліся таксіны: эпаксіды, альдэгіды, кетоны. Іх значна больш у алеі, які няправільна захоўваюць.

Калі прыносіце алей дадому, лепш пераліць яго ў цёмную шкляную бутэльку. Некаторыя ставяць такую тару побач з акном, дзе прамыя сонечныя прамяні, або побач з плітой ці ракавінай. Ультрафіялет і павышаная тэмпература актывуюць акісляльныя працэсы. Лепш захоўваць бутэльку з такім прадуктам у цёмным халодным месцы, але не ў халадзільніку.

Дарэчы, у фрыцюры або на патэльні неабавязкова выкарыстоўваць сланечнікавы рафінаваны алей, калі ў продажы ёсць той, што ад іншых культур. Таннейшы, напрыклад, кукурузны. Калі ён якасна ачышчаны, то розніцы не будзе, таму што ўсе рафінаваныя алеі пазбаўляюцца смаку і паху. А вось замяняць рафінаваны алей пры смажанні якім-небудзь экзатычным нерафінаваным небяспечна. Для высокіх тэмператур ніякі нерафінаваны алей не падыходзіць.

# КАЛІ ЗНІКАЮЦЬ ДЗЯСНЫ...

## Ці можна запаволіць развіццё парадантозу?

**Да стаматолага мы прывычаіліся хадзіць у асноўным для лячэння зубоў, радзей — для прафілактыкі. Але вельмі важна сачыць і за станам тканкі, якая абкружае зуб — парадонтам. Парадантоз і парадантыт — захворванні, якія паражаюць зубное «атачэнне». Зубная тканка перастае выконваць функцыю ўтрымлівання, што можа прывесці да страты зубоў. І калі парадантыт звычайна «паказваецца» адразу, то заўважыць парадантоз няпроста. Як на яго своечасова звярнуць увагу і ці магчыма вылечыць, расказала стаматолаг-хірург 7-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі Вольга КОМАР.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

***— Вольга Раманаўна, што за захворванне — парадантоз? Як яно сябе праяўляе?***

— Нярэдка яго блытаюць з парадантытам. Але гэта розныя захворванні. Парадантыт — паражэнне мяккіх і косных тканак, якія акружаюць і падтрымліваюць зуб. Яно наступае пасля гінгівіту — запалення і крыватачывасці дзясны. Пры дрэннай гігіене стан пагаршаецца, запаленне прагрэсуе, уцягваюцца новыя ўчасткі парадонта, у выніку змяншаецца аб'ём коснай тканкі. Усё гэта суправаджаецца крыватачывасцю і гнойнымі выдзяленнямі. У большасці выпадкаў так працякае парадантыт.

**Калі адсутнічае пэўная колькасць зубоў, з дапамогай артапедычных канструкцый адбываецца стабілізацыя. Ёсць шыны рознай накіраванасці ў залежнасці ад ступені захворвання**

Парадантоз сябе паводзіць па-іншаму: дзясна бледная і светлая, але таксама адбываецца змяншэнне коснай тканкі. Гэта хранічнае захворванне, і пры пачатковых стадыях пацыент нават не падазрае аб яго развіцці. Бадай, адзінае, што можа ўсхваляваць, — невялікая крыватачывасць пры гігіене поласці рота. Яркіх запаленчых клінічных праяў тут няма. Звычайна пацыент звяртаецца да ўрача, калі заўважае, што паміж зубамі з'яўляюцца цёмныя трохкутнікі — захворванне зайшло ўжо далёка.

І калі парадантыт сустракаецца ў 90 % насельніцтва, то парадантоз — нашмат радзей, усяго ў 3 %.

***— Ад чаго вакол зубоў утвараюцца трохкутнікі?***

— Дзясна апускаецца, змяншаецца косная тканка, і знешне гэта праяўляецца ў выглядзе цёмных трохкутнікаў.

***— Ці можна неяк заўважыць хваробу да з'яўлення трохкутнікаў?***

— У асноўным гэта толькі крыватачывасць: чысціш зубы, а дзясны крывавяць. Акрамя таго пры схільнасці да парадантозу дастаткова хутка ўтвараецца зубны камень. Спачатку гэта мяккі зубны налёт, які толькі раздражняе дзясну, але пры недастатковай гігіене пакрысе ён мінералізуецца і ператвараецца ў зубны камень. А гэта ўжо цвёрдая структура, якая ціснe на дзясну і косць, і, як правіла, адбываецца змяншэнне коснай тканкі ў апікальнай (перад'язычнай) вобласці. Падкрэслю, гэта дастаткова хуткі працэс, таму варта сачыць за ўтварэннем зубнога каменя.

***— У чым прычыны парадантозу?***

— Яны могуць быць розныя. У асноўным гэта парушэнне кровазабеспячэння коснай тканкі. І трэба разабрацца, чаму так адбываецца. Гэта або нейкае сістэмнае захворванне, напрыклад, цукровы дыябет, ВІЧ, гепатыт — тое, што парушае трофіку тканак. Або прымяненне пэўных лекавых прэпаратаў, якія маюць такі ўплыў. Курэнне моцна пагаршае трофіку мяккіх тканак, нярэдка ў курыльшчыкаў узнікае такая праблема. Прычынай можа быць і траўматызацыя — артапедычнай канструкцыяй ці пломбай. Няправільны прыкус ці зменены становішча зуба ў дузе таксама выклікае траўміраванне і, адпаведна, змяншэнне коснай тканкі.

Акрамя таго, у кожнага з нас свой біятып дзясны. Калі яна тонкая, трэба пацыента папярэджваць, што яна можа траўміравацца нават падчас няправільнай гігіены. Нанесці шкоду можна не толькі зубной шчоткай, але і зубным каменем, пры правядзенні рэстаўрацыі — калі ставіцца пломба. Такая сама па сабе тонкая кволая дзясна траўміруецца пры нязначным уздзеянні. У тым ліку і з-за няправільнага становішча зуба.

Трэба сказаць, што ў старэйшага пакалення праблемы з парадонтам былі больш распаўсюджаныя. Бо ніхто на гэтым не засяроджваўся, ды і чысцяць зубы далёка не кожны ў пасляваенны час. Цяпер гэта актуальная тэма ў стаматалогіі, і пры жаданні праблемы можна вырашыць.

***— Парадантоз можна вылечыць?***

— Нельга сказаць, што цалкам, хіба што лёгкую ступень. У залежнасці ад ступені цяжкасці парадантозу падбіраюцца розныя методыкі лячэння, якія дазваляюць спыніць яго развіццё. Таму стабілізаваць захворванне можна. Калі пацыент звяртаецца з гіперыміраванай ацёчнасцю слізістай дзясны ці невялікім зрушэннем, але няма яркіх клінічных праяў, то захворванне можна стабілізаваць, вывесці на нейтральны ўзровень, і, ведаючы, што маецца схільнасць, назіраць і карэктаваць стан.

***— Такім чынам, калі заўважыў пры чыстцы зубоў кроў...***

— ...трэба звярнуцца да стаматолага і высветліць прычыну. Ні ў якім разе не займацца самастойным лячэннем, як у нас некаторыя робяць. Ёсць спецыяльны кірунак у стаматалогіі, і парадантолагі займаюцца лячэннем дзяснаў. Тактыку вызначае ўрач. Калі пачатковая стадыя, то гэта якасная гігіена. Акрамя таго, збіраецца анамнез пацыента. Калі ёсць пэўныя сістэмныя захворванні, то назіранне робіцца з ухілам на гэта.

Развіццю захворвання садзейнічае патагенная мікрафлора ў поласці рота. У ЗША было праведзена даследаванне, у якім удзельнічала каля пяці тысяч студэнтаў. Іх праверылі на наяўнасць патагеннай мікрафлоры, якая выклікае парадантоз. Даследаванне паказала, што ўмоўна-патагенная мікрафлора ёсць ва ўсіх, а вось захворванне развіваецца толькі ў 3 %. Таму на пачатковай стадыі важная гігіена. І калі ёсць сістэмнае захворванне — гэта карэкцыроўка яго лячэння ці назіранне.



Медыкаментознае лячэнне пачынаецца пры сярэдняй і цяжкай ступенях. Сярэдняя ступень цяжкасці характарызуецца змяншэннем коснай тканкі, маюцца нязначныя міжзубныя прамежкі, цёмныя трохкутнікі, нязначная рухомасць — 1-2 ступені. Тады, акрамя гігіены, робіцца павязкі і аплікацыі, а таксама шынiраванне. Зубы ўмацоўваць шкловалакном — па ўнутранай паверхні наклейваецца палоска, якая мацуецца на фотаматэрыял, дзякуючы чаму зубы знаходзяцца ў звязку і становяцца менш рухомыя. Калі адсутнічае пэўная колькасць зубоў, з дапамогай артапедычных канструкцый адбываецца стабілізацыя. Ёсць шыны рознай накіраванасці ў залежнасці ад ступені захворвання — ад тэрапеўтычных фоташын да больш складаных артапедычных канструкцый.

***— Парадантоз ускладняе імплантацыю?***

— Безумоўна. Некаторыя думаюць, што выдаляць зубы і паставяць імпланты. Ёсць вялікі нюанс: імплантацыя пры наяўнасці парадантозу ўскладняецца, бо косная тканка зменшаная і не дазваляе паставіць імплант. Калі цяжкая ступень захворвання, то варта рабіць косную пластыку, да таго ж важная сама дзясна — яе шчыльнасць і стан. Калі побач з адсутным зубам — запалены парадантозны зуб, то гэта супрацьпаказанне да імплантацыі, бо імпланты могуць не прыжыцца.

Пры цяжкай ступені прымяняецца хірургічны метад лячэння. Робіцца кюртаж кішэняў: адкрываецца лоскут, чысціцца патагенная мікрафлора; калі моцна зменшана дзясна, робіцца аперацыя па нарошчванні аб'ёму дзясны. Ёсць розныя методыкі: калі зуб мае шмат каранёў, і пад ім адсутнічае косць, падсыпаецца штучная, або робіцца забор невялікай часткі ўласнай косці. Сёння магчыма амаль усё.

Але зноў-такі, тут вельмі важная гігіена. Калі ў пацыента нездавальняючая гігіена пры хірургічных аперацыях, то працэнт поспеху адразу змяншаецца. Таму спачатку ўрач матывуе і навучае пацыента.

***— Колькі можа заняць лячэнне пры парадантозе?***

— Калі пачатковая стадыя, на працягу аднаго-двух месяцаў пацыент выконвае рэкамендацыі і назіраецца. Калі ўдалося прыпыніць захворванне, і запаленчых працэсаў няма, то раз на паўгода-год трэба наведваць стаматолага проста для прафілактыкі. Калі больш цяжкая ступень, то наведваць урача прыйдзецца часцей. Калі цяжкая, то лячэнне займае да двух гадоў — там ідуць косныя аперацыі, пластыка. Усё гэта — працэс няхуткі: зрабіў аперацыю — тры месяцы вывучаецца дынаміка, потым выконваецца наступнае ўмяшанне. Усё ж поласць рота — вільготнае асяроддзе, дзе адначасова ўсе аперацыі не зробіш.

У любым выпадку, пры парадантозе трэба назірацца, і сам урач вызначае, як часта яго наведваць. Акрамя асноўных сродкаў гігіены — шчоткі і пасты — патрабуюцца дадатковыя. Гэта ёршыкі, ірыгатары, тут таксама трэба кансультавацца з урачом, адпаведныя сродкі падбіраюцца індывідуальна. Наогул, такое захворванне нельга пакідаць на самацёк. Пры належным доглядзе і назіранні поспех будзе.

# МОЖНА ТОЛЬКІ ПАЧУЦЬ,

## альбо «Як грошай на машыну, дык мамка, дай...»

**Недзе чытала, што мыццё — уручную — прыраўноўваецца да работы трактарыста (прасаванне — да работы муляра), што дзень звычайнай хатняй тупаніны забірае ў жанчын, столькі ж энергіі, колькі два футбольныя матчы ў футбаліста, што за год мы перамываем пяць тон посуду і «прабягаем» «ад печы да парога» (а ў гарадах — ад мыйкі да пліты?) больш за тысячу кіламетраў...**

**Цікавая інфармацыя, хоць, шчыра кажучы, асаблівага даверу яна не выклікала (бо хто ж, здавалася, тое лічыў-вымяраў?)...**

**Недаацэньваем тэхніку, якая насамрэч можа (і, відаць, даўно?!) не толькі мыць-прыбіраць-прасаваць, але і засведчыць, што той жа абед для невялічкай сям'і і на гэткай жа невялічкай кухні — гэта амаль... тысяча крокаў, якія дай бог прайсці.**

### СМЕХ СМЕХАМ

Спадарыня Ала жыве адна. І досыць даўно. Днямі, казала, заўважыла, што пачынае сама з сабой размаўляць: раіцца, нахвальваць, сварыцца, шукаць кампрамісу...

Даслоўна: «Іду вось раніцай на кухню і кажу сабе, што трэба зрабіць сняданак. Потым сама ў сябе пытаюся: «Ты есці хочаш?». Сама ж адказваю: «Не, пакуль не хачу»... Дык нашто тады гатаваць? Глядзіш — была задача, і тут жа яе няма.

Расказала пра гэта сваім — сыну, сястры... Яны пасмяяліся. Мне таксама смешна — пакуль...»

Канец цытаты.

### НЕЛЮБОЎ? ДА ХАЛАДОЎ

Крамы таварам забітыя: што называецца, носа не ўткнуць, нешта з адзежы з краміштэйнаў не выцягнуць, не разгледзець як след, хоць...

Спадніца спадабалася — доўгая, чорная, у такой куды хочаш можна пайсці: зранку — на работу, вечарам — у госці...

— Яна з жакетам, гэта касцюм, — абарвала думкі прадавачка. — І, дарэчы, на вас...

Прыйшлося памераць: спадніца — нібыта тут і была, а вось верх...

— Велікаваты як быццам?

— Ну што вы? У самы раз! — пераконвала дзяўчына, ды гэтак настойліва...

Узяла, прынесла дамоў і спадніцу нават насіла. А вось жакет...

Хто яго толькі не мераў! Некаму з сяброўак-сваячак-суседак не падыходзіў фасон, некаму колер, памер... У выніку новая добрая рэч з крамнаю біркай у шафе так бы і звіселася, калі б... не маразы, якія прымусілі выцягнуць, надзець і ўбачыць, што жакет зусім не вялікі («мой памерчык», як казаў Папандопала), а ўжо ж цёплы, утульны, мілы...

Яшчэ і тым, дарэчы, што... нікому не падышоў.

...Гэта мы пра што? Пра адзежыну, рэч? Хоць з тым жа поспехам маглі пра... чалавека.

### РЭЧ З ГІСТОРЫЯЙ

Першая ў пад'ездзе стол-кніга з'явілася ў Львоўны. Суседзі пра гэта ведалі і час ад часу прыходзілі пазычаць, каб дома сабраць гасцей, каб адсвяткаваць — хто вяселле, хто юбілей, хто радзіны...

Потым жыццё змянілася, і стол часцей сталі браць на хаўтуры.

Цяпер (нават на іх!) грамада ўжо не збіраецца — каранцін, і стол стаіць непатрэбны.

### АБ ШТО РАЗБІВАЮЦЦА МАРЫ

І шчасціла ў жыцці, і няшчасціла, але каб так...

Мы загадзя, да дробных драбніц спланавалі водпуск, купілі білеты, даляцелі да Барселоны, даехалі да цёплага мора, пасяліліся ў атэлі... Потым з яго па адмысловай лесвіцы (да сёння ў вачах!) спусціліся на пляж і ўбачылі, які ж там цёплы пясочак, якая чыстая ціхая вада!.. Мы нават пакупаліся ў ёй (ура!) і прайшлі па беразе: з асалодай выпілі кавы, з'елі марожанае.

Гэта ўсё днём, а ўвечары мы ўжо мералі тэмпературу (за 39!) і чакалі доктара.

...Чула, што той прыехаў, бачыла, як падышоў да ложка, што здзівіла — працягнуў руку:

— Канстанцін.

Падала сваю. Назвала імя.

Далей — ці не ўсё як звычайна? Доктар пытаў, калі і адкуль прыляцелі, што елі-пілі, чым хварэлі, на што алергія — «агучыў» дыягназ, выпісаў рэцэпт з падрабязным апісаннем, як прымаць і якіх наступстваў чакаць — заўтра, паслязаўтра...

На той выпадак, калі нешта пойдзе не так, пакінуў свой нумар тэлефона і папрасіў званіць яму — нават уночы (?).

Вось гэта, апошняе, як і першае (поціск рукі) здзівіла, здаецца, найбольш. Мы нават памарылі, што некалі і ў нас, дома, доктар вось гэтак жа будзе прыходзіць — падаваць руку і разам з ёй — цвёрдае адчуванне, што ты ў бядзе не адзін, што цябе выцягнуць... Абавязкова!

Тры гады прайшло — мара пакуль не збылася. І (пандэмія...) ужо, напэўна, не збудзецца.

Як там у Губермана?

*Учусь терпеть, учусь терять*
*и при любой житейской стуже*
*учусь, присвистнув, повторять:*
*Плевать, не сделалось бы хуже.*

### ЯК ЁСЦЬ...

Яны абедзве, і котка, і гаспадыня, былі ў гадах — яшчэ мякка кажучы...

І хвароб у абедзвюх таксама хапала. У жанчыны, прынамсі, цукровы дыябет, сэрца, суставы...

Але ж калі захварэла котка і дзеці адмовіліся завезці яе ў клініку, бабуля сама наняла таксі, паехала да доктара — на кансультацыю, потым — на ўколы...

Можа, па дарозе дзе, можа, у той лячэбніцы да жанчыны прычапіўся ковід, і справіцца з ім яна не змагла.

А котка — тая нішто сабе, паправілася і цяпер жыве ў дзяцей.

### АРГУМЕНТ

Дзе адзін Якубавіч, там смех, дзе два — там, здараецца, рогат: гумарныя браты, і абодвух, як выглядае, хлебам не кармі — дай пахваліцца, хоць чым. Старэйшы, напрыклад, не праміне сказаць, што вайну заспеў, хоць нарадзіўся ў лютым 43-га і ўсяго, што помніць, як «на сваіх крывых» (ад рахіту) уцякаў ад роднага бацькі (той з фронту вярнуўся)... А малодшы — народжаны ў лютым праз дзесяць гадоў, што жыў «пры Сталіне».

Дарэчы, калі «бацька народаў» памёр, іх бабуля моцна гаравала, і старэйшы з гэтых унукаў дагэтуль помніць, як яе суцяшаў. Прасіў: «Ну не плач ты... Калі вельмі трэба, у нас яшчэ адзін Сталін народзіцца... У мяне ж во брат нарадзіўся!»

### ЛАВІСЯ, РЫБКА...

Знаёмец выйшаў на пенсію, не паспеў як след адпачыць — кінуўся шукаць работу ці хоць нейкі занятак.

На блізкай рэчцы мужчын заўважыў, да аднаго падышоў: далікатна пацікавіўся, якая рыба клюе і на што? Выслухаў адказ, абдумаў — папытаў, дзе лепей вуды купіць, і крышку павесялеў, вырашыў, што яно ж на карысць:



і тэлевізар глядзець не буду, і нешта злаўлю... Хай не кожны дзень, хай каты...

Вось толькі той...

Да плотак, паршывец, яшчэ падышоў, панюхаў — паглядзеў у вочы гаспадару: «Ты хочаш, — моўчкі спытаў, — каб я гэта з'еў?» — «А што, — здзівіўся кармілец, — не будзеш?» Кот — нават не падумаў: задраўшы хвост, пашыбаваў прэч.

І потым за ўвесь надвячорак ні разу не падышоў! І спаць з ім таксама не лёг... «З тыдзень не размаўляў, — скардзіўся знаёмец. — Мусіць, падумаў, што я атруты прынёс?.. Вось і ляві гарадскую рыбу, вось і еш яе».

### ВАЕННАЯ ХІТРАСЦЬ

«...Пайшлі са мной! — ледзь павітаўшыся, загадвае сваячка (ёй пяты гадок). — Я вам цацкі свае пакажу». — «Калі ласка, не ўсе, — просіць дачку матуля, — толькі самыя-самыя... Добра? А то гасцей без вячэры пакінеш».

І сапраўды, бо цацак у малой — проста безліч, як, відаць, у многіх сённяшніх дзяцей: іншае пакаленне, іншае жыццё.

У пасляваенным, як расказваў адзін з дзядоў, яны, малыя, гулялі з каваладкам аўчыны, да якой мацаваўся грузік, усё гэта нагой падкідвалася ўверх (хто вышэй?!) і потым прыгожым «парашуцікам» апускалася ўніз... Цікава, калі б не чарга: дзяцей тады збіралася шмат, цацка была адна. Ды і кажух «знаёмы» толькі адзін.

З маразамі гаспадар яго выцягнуў з шафы, хацеў апрануць і вачам не паверыў: дзірка — з кулак! — пад правай пахай і амаль такая ж — пад левай! Адкуль?

...Як паказаў «допыт», латкі выразаў яго сынок.

Чаму з-пад пах? Ваенная хітрасць: думаў, што ў гэтым месцы бацька не заўважыць. Ды і мароз туды не залезе.

### ЯНЫ І МЫ

Віка не замужам. І не была. Кажа, што сама вінаватая, бо маладая-дурная, закахалася ў жанатага, з перыферыі. Той раз на месяц прыязджаў, кляўся-бажыўся, што развядзецца, зробіць кар'еру (ён казаў: «Возьме Мінск»), і ўжо тут распачне новае жыццё з ёю. Віка спала і бачыла... Галоўнае — зблізку, можна сказаць, бо каханак і сапраўды падымаўся ўгору!

Зваліўся ўраз: няшчасны выпадак, трое пацярпелых, крымінальная справа... Не да Вікі было... Ды і засталося. Адна яна, хоць кавалеры здараюцца.

Па выхадных, прынамсі, яна да бабулі ездзіць — у краму схадзіць, нешта прыбраць, памыць...

Надаечы вось праведвала; каля пад'езда бабулін сусед запыніў (прыгожы, казала, мужчына, інвалід-калясачнік): «камплімент адвесціў» — сказаў, калі б быў здаровы, то дакладна з ёй ажаніўся б!

Рада была: цэлы дзень на крылах лётала, а ўвечары неяк само дайшло, што калі б ён быў здаровы, то, пэўна ж, недзе працаваў бы, некуды ездзіў-хадзіў, з некім сустракаўся і таксама ажаніўся б.

Як усе яе аднакласнікі і ўсе аднагрупнікі...

І далёка не ўсе аднакласніцы-аднагрупніцы.

### МОЖНА ТОЛЬКІ ПАЧУЦЬ...

Горад, раніца, нешырокая сцежка ў снезе. Па ёй штодня да прыпынку — назад, балазе ён блізка — рукою падаць... І тралейбус якраз «на падыходзе»: калі падбегчы, можна паспець.

Зрываемся з месца, бяжым, «па дарозе» даганяем жанчыну. Яна таксама як быццам «бяжыць», праўда, вельмі марудна, бо ў так званай дублёнцы, бо «сем пудоў» важыць і ў абедзвюх руках валачэ па сумцы.

Адну з іх мы маглі б «падхапіць», дапамагчы жанчыне, але тады на гэты тралейбус не паспелі б ні мы, ні яна. А так — шанц ёсць. І рэальны: мы, што называецца, ідзём на абгон, залятаем у салон і... нікуды не едзем, таму што следам за намі (кіроўца — чалавек: пачакаў!) у адчыненыя дзверы тралейбуса караскаецца тая жанчына, спехам (бо ў яе звініць тэлефон) ставіць сумку (выглядае — на чыюсьці нагу, бо тут жа ўздымаецца вэрхал), выцягвае з кішэні мабільнік, ссоўвае шапку — адказвае на нечае «прывітанне, ты дзе?» яшчэ спакойным: «У тралейбусе. Еду ў вёску». — «Чаму сваім ходам? — пытаецца нехта. — Што зяць?..»

Раз'юшаны бык спакайней бы, відаць, «прыняў» чырвонае, чым жанчына адзін напамін...

— Што зяць?! — на ўвесь салон паўтарае яна. — А ты дык не ведаеш?! Як грошай на машыну, дык ты, мамка, дай, а як падвезці куды, дык, цешча, пайшла ты...»

Яна кажа, куды, і пасля гэтага народ перад ёй моўчкі расступаецца: дае прайсці да свабоднага месца (яно, як ні дзіўна, знайшлося) і нават падстаўляе сумкі.

Значыць, разумее, што вось гэту, як стрэл, кароткую фразу нельга прыдумаць, — можна толькі пачуць...

Ад таго, хто папярэдне «выплакаў».

### ПЫТАННЕ НА ЗАСЫПКУ

...Некалі даўно — і, вядома ж, з нагоды — злажылася кароткае:

*Кожны ранак ёсць прычына*
*Дыфірамбы пець мужчынам*
*І прасіць іх, дарагіх,*
*Ад бяды і адзіноты*
*Ад нястачы і самоты*
*Берагчы найперш малых,*
*Берагчы сваю Айчыну,*
*Берагчы сваю жанчыну*
*І хоць парачку чужых.*

Потым і неяк міжволі гэтыя радкі «перапісаліся» і загучалі трохі інакш:

*Кожны ранак ёсць прычына*
*Дыфірамбы пець жанчынам*
*І прасіць іх, дарагіх,*
*Ад бяды і адзіноты*
*Ад нястачы і самоты*
*Берагчы найперш малых,*
*Берагчы сваю Айчыну,*
*Берагчы свайго мужчыну*
*І хоць парачку чужых.*

Хто-ніхто палічыў гэта «формулай шчасця» (нават агульнага), для якога чаго толькі нам не зычаць?! Міхайлаўна — апроч іншага і найбольш сваім раўналеткам — лёгкай хады і яснай памяці!.. Надаечы, праўда (шмат было віншаванняў!), «зарапартавалася» і памяці пажадала... светлай.

Разам пасмяяліся. Разам думалі: памылілася яна ці ўсё ж такі не?

**Валянціна ДОЎНАР.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 19 марта 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
